

ПРАВІЛЫ БЯСПЕЧНЫХ ПАВОДЗІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Сямейная газета

ДАПАМОГА Ў ДОГЛЯДЗЕ ІНВАЛІДАЎ І ПАЖЫЛЫХ

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 КРАСАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 74 (29188)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Па даручэнні кіраўніка дзяржавы Адміністрацыя Прэзідэнта арганізавала маніторынг сітуацыі ў лёгкай прамысловасці — у частцы вытворчасці масак, камбінезонаў і касцюмаў, якія так неабходны медыцынскім работнікам. Прадпрыемствы «Беллегпрама» актыўна ўключыліся ў гэтую працу. Мы са старшынёй Мінскага аблвыканкама азнаёміліся з вытворчасцю ААТ «Світанак». Прадпрыемства, з улікам сітуацыі, якая склалася, аператыўна перастроіла работу. Тут працуюць у тры змены. Вытворчасць ужо склала сумарна больш за 1 мільён масак — вырабы са спанбелу, трыкатажу і марлі. Прадпрыемства можна браць за ўзор па выпуску гэтага віду прадукцыі».*

# РАЗДРУКАВАНАЯ ДАПАМОГА



Жодзінскі прадпрымальнік Магсад МУСТАФАЕЎ далучыўся да ініцыятывы бясплатнай дапамогі медыцынскім работнікам свайго рэгіёна і забяспечвае іх ахоўнымі шчыткамі, раздрукаванымі на 3D-прынтары.

## КОРАТКА

• Забароны на наведванне месцаў пахавання ў перыяд маючых адбыцца рэлігійных свят у Мінску ўводзіцца не будуць. Да месцаў пахавання пусцяць дадатковыя аўтобусы.

• **Палёты праз Нацыянальны аэрапорт Мінск скараціліся на 76 %.**

• Мінскаму гарадскому цэнтру нерухомасці дэлегаваны паўнамоцтвы на правядзенне аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзянам Беларусі.

• **Беларускія мастакі запусцілі дабрачынны анлайн-аўкцыён у падтрымку медыкаў. За атрыманыя сродкі будуць набыты маскі, акуляры, рэспіратары, халаты, плашчы, камбінезоны і абсталяванне.**

Разумныя грошы

# НЕ САМЫ ЧЫСТЫ ТАВАР...

### Усё часцей мы задумваемся, ці варта дакранацца да банкнотаў і манет




**Грошы адносяцца да самых брудных прадметаў на планеце. Яны праходзяць праз тысячы рук і сотні кашалькоў, гаманкоў і манетніц. Чаго толькі няма на банкнотах і манетах! Вірусы, бактэрыі і мікробы падарожнічаюць на грашовых знаках, як мы на самалётах і цягніках. Як абараніць сябе і сваіх дзяцей ад «грашовых» хвароб у час эпідэміі?**

### Фаміты ў кішэні

Чым даўжэй наяўныя грашовыя сродкі падарожнічаюць па свеце, тым большая імавернасць сустрэць на іх паверхні ўсялякага роду патагенныя мікраарганізмы. Старыя грошы ўтойваюць у сваіх мікратрэшчынах і загінах значна большую колькасць непрыязных нам вірусаў і мікробаў, чым новыя.

СТАР. 4

Крэатыў

# ГІДРАМЕТ НА ШКОЛЬНЫМ ДВАРЫ

### Як увасабляюцца экалагічныя знаходкі асіповіцкіх школьнікаў

**Пры асіповіцкай школе № 3 вось ужо 25 гадоў існуе маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Дзеля жыцця на зямлі». Чвэрць стагоддзя школьнікі займаюцца даследаваннем біяразнастайнасці расліннага і жывёльнага свету на тэрыторыі раёна, вывучаюць пытанні энерга- і водазберажэння, маніторацЬ паветра, шукаюць шляхі бяспечнага абыходжання з адходамі, праводзяць асветніцкую ў экалагічным плане работу сярод насельніцтва. Лічбы кажуць самі за сябе: 30 вучняў гэтай школы з'яўляюцца лаўрэатамі Прэзідэнцкай прэміі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў менавіта па экалагічным кірунку.**




Кнігі па выніках даследаванняў.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

# ДЛЯ АСОБ ФІЗІЧНЫХ І ЮРЫДЫЧНЫХ

## РЫХТУЕЦЦА ПРАЕКТ УКАЗА АБ ПАДТРЫМЦЫ ЭКАНОМІКІ

**У краіне распрацоўваюцца кропкавыя меры падтрымкі суб'ектаў гаспадарання і людзей, якія апынуліся ў складанай эканамічнай сітуацыі з-за каранавіруса.**

«Урад бачыць гэтую праблему і ставіць задачы па яе рашэнні. Распрацоўваецца комплекс мер, накіраваных на падтрымку эканомікі і сацыяльнай сферы. Рэальнаму сектару пашыраны асартымент і павялічаны аб'ёмы гарантый па крэдытах, якія даюцца ўрадам. Нямала прапаноў уносяць і дэпутаты, — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Леанід БРЫЧ.** — Робіцца ўсё неабходнае, каб максімальна захаваць рабочыя месцы, мінімізаваць рызыкі і страты для прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці. Разглядаюцца варыянты падтрымкі фізічных асоб, чые даходы скараціліся з-за пандэміі».

Парламентарый растлумачыў, што комплекс эканамічнай падтрымкі будзе рэалізаваны ў некалькі этапаў. Вядзецца падрыхтоўка праекта адпаведнага ўказа. У прыватнасці, разглядаюцца магчымасці пераносу тэрмінаў выканання суб'ектамі гаспадарання падатковых абавязацельстваў, надзялення мясцовых Саветаў дэпутатаў правам уводзіць паніжальныя каэфіцыенты да маёмасных падаткаў, «падатковых канікул» для індывідуальных прадпрымальнікаў і самазанятых. Яшчэ адной дзейснай мерай у гэтым кірунку можа стаць павелічэнне тэрмінаў знешнегандлёвых аперацый з 180 да 280 каляндарных дзён.

«Мы прапануем прыпыніць выплаты сум асноўнага доўгу і працэнтаў па крэдытах, даць малому і сярэдняму бізнесу канікулы на выплату камунальных паслуг. Яшчэ адзін з варыянтаў падтрымкі — прапанаваць пацярпелым ад пандэміі акцыянерным таварыствам правесці дадатковую эмісію прывілеяваных акцый з наступным набыццём іх дзяржавай з безумоўным правам зваротнага выкупу ў поўным аб'ёме, калі сітуацыя нармалізуецца», — адзначыў Леанід Брыч.

Таксама прадугледжваецца спрашчэнне парадку і ўмоў выдзялення дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі сем'ям, якія ў цяперашніх умовах страцілі прыбытак. Сярод прэферэнцый — у тым ліку вызваленне ад налічэння пені (да шасці месяцаў) у выпадку нясвоечасовай аплаты камунальных паслуг.

Асаблівую ўвагу распрацоўшчыкі комплекснага плана звяртаюць на магчымасці забеспячэння аддаленай работы персаналу прадпрыемстваў і дыстанцыйнага навучання школьнікаў і студэнтаў.

Акрамя таго, на працягу месяца ўрад дасць ільготы для турыстычнай галіны, якая найбольш пацярпела ад распаўсюджвання каранавіруса.

«Цяпер вывучаем вопыт іншых краін — тых жа Расіі, Францыі, Германіі, Іспаніі, Італіі, таму што краіны, якія былі больш схільныя да каранавіруса, ужо на дзяржаўным узроўні прымаюць нейкія рашэнні, — цытуе БелТА **міністра спорту і турызму Сяргея КАВАЛЬЧУКА.** — Мы таксама будзем прапаноўваць пакет мер. Патрэбныя падатковыя, крэдытныя, арэндныя льготы. Мы на этапе прапрацоўкі гэтага пытання. У найбліжэйшы час, думаю, рашэнні будуць прынятыя».

Дарэчы, на мінулым тыдні беларускаму боку ўдалося вярнуць на радзіму ўсіх турыстаў-суайчыннікаў, якія адпраўляліся ў іншыя краіны праз турфірмы і затрымаліся там пасля закрыцця граніц. Па тых грамадзянах, якія з'ехалі за мяжу самастойна, рашэнне прымуць у найбліжэйшы час.

# А Ў НАС У КВАТЭРЫ... ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ!

**Выдаткі на электразабеспячэнне жыллёвага фонду, які эксплуатуецца, будуць кампенсаваныя.**

На нядаўняй нарадзе Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў, што выступае за стымуляванне людзей да спажывання электраэнергіі ў жылых дамах, бо гэта больш бяспечна за карыстанне прыродным газам і важна з пункту гледжання эканомікі.

Як пацвярджэнне, кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ «Аб кампенсацыі выдаткаў на электразабеспячэнне жыллёвага фонду, які эксплуатуецца», паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Дакумент прыняты ў мэтах стымулявання насельніцтва да выкарыстання электрычнай энергіі для патрэб ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы. Гэта датычыцца аднакватэрных жылых дамоў.

У адпаведнасці з указам грамадзянам будзе кампенсавацца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў частка выдаткаў на правядзенне электразабеспячэння жыллёвага фонду для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы — у памеры 20 % ад кошту выкананых работ, але не больш за 40 базавых велічынь.

Для кампенсацыі выдаткаў грамадзянін павінен быць уключаны ў спісы, што фарміруюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Указам прадугледжана адпаведная адміністрацыйная працэдура і вызначаны пералік дакументаў, якія чалавек павінен прадставіць у мясцовы орган улады.

На працягу трох месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання ўказа ўрадам будзе вызначаны парадак пакрыцця выдаткаў на электразабеспячэнне.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЗША прыпынілі фінансаванне СААЗ



Пра гэта паведаміў на брыфінгу ў Белым доме прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. «Узносы прыпыняем да правядзення ацэнкі ролі СААЗ у дрэнным кіраванні і ўтойванні інфармацыі аб распаўсюджванні каранавіруса», — цытуе амерыканскага лідара ТАСС. Прэзідэнт ЗША нагадаў, што амерыканскія падаткаплацельшчыкі штогод уносяць у бюджэт гэтай арганізацыі ад 400 да 500 мільёнаў долараў. Пры гэтым, на думку Трампа, СААЗ «не справілася са сваім асноўным абавязкам і павінна несці адказнасць». Рашэнне ЗША выклікала негатыўныя водгукі. У прыватнасці, генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш лічыць, што цяпер не час прыпыняць выплату ўзносаў у бюджэт Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. «СААЗ павінна аказвацца падтрымка. Абсалютна неабходна, каб свет перамог у вайне з COVID-19. Сусветная арганізацыя аховы здароўя, тысячы яе супрацоўнікаў ваююць на перадавой, аказваючы дапамогу дзяржавам і іх грамадзянам, асабліва найбольш уразлівым, даючы ім рэкамендацыі, абсталяванне, навучаючы медработнікаў», — заўважыў кіраўнік ААН.

## МВФ прагназуе самы глыбокі спад у эканоміцы з часоў Вялікай дэпрэсіі



Паводле ацэнак Міжнароднага валютнага фонду, у рамках базавага сцэнарыя чакаецца скарачэнне глабальнага ВУП на 3 працэнты. «Гэты крызіс — беспрэцэдэнтнае ўзрушэнне. Спынена дзейнасць важных сфер эканомікі», — заўважыў намеснік дырэктара дэпартамента даследаванняў МВФ Джан-Марыя Мілезі-Ферэці.

Эксперты МВФ лічаць, што, нягледзячы на прыняцце ў многіх краінах праграм па захаванні рабочых месцаў, узровень беспрацоўя ў свеце рэзка ўзрасце. ВУП краін зоны еўра страціць 7,5 % — самая моцная рэцэсія ў параўнанні з іншымі дзяржавамі і рэгіёнамі. «Эпідэмія нанесла Еўропе цяжэйшы ўрон, чым у іншых рэгіёнах свету», — растлумачыў Euronews Джан-Марыя Мілезі-Ферэці. Канчатковы ўплыў крызісу на эканоміку, як і тэрміны аднаўлення, вельмі няпэўныя, але калі абмежавальныя захады будуць працягвацца і пасля другога квартала, а Covid-19 прывядзе да яшчэ адной, умеранай, пандэміі, то спад сусветнай эканомікі павялічыцца ўдвая.

## Заснавальнік Amazon павялічыў свой капітал за дзень на $6,4 млрд




Джэф Безас, які ўжо змог зарабіць на крызісе дзякуючы павышанаму попыту на паслугі анлайн-рытэйлу, павялічыў уласны капітал да 138 мільярдаў долараў. Гэта адбылося на фоне рэкорднага росту кошту акцый яго карпарацыі, піша Forbes. Каціроўкі каштоўных папер інтэрнэт-рытэйлера Amazon падскочылі на 5,3 працэнта. У выніку капіталізацыя кампаніі склала амаль 1,14 трыльёна долараў. Amazon з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце анлайн-рытэйлераў, а таксама ажыццяўляе «воблачныя» паслугі. Акцыі кампаніі выглядаюць як «бяспечная гавань» для інвестараў у цяперашняй сітуацыі, заўважае MarketWatch. Amazon выйграе ў іншых дзякуючы сваім асноўным бізнесам — у прыватнасці, рознічны анлайн-гандаль рэзка вырас пасля закрыцця звычайных крам. З пачатку гэтага года акцыі кампаніі падаражэлі амаль на чвэрць. Аналітыкі паляпшаюць прагноз выручкі Amazon, хоць агульны трэнд для вялікіх кампаній — зніжэнне. Як мяркуюць эксперты, у першым квартале Amazon атрымае выручку ў раёне $72,5 млрд, а па выніках года — $334,14 млрд.


**Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал) ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

**АУКЦИОН № 3014, ЛОТ № 18308**

- Капитальное строение с принадлежностями, инвентарный номер 451/С-10967, площадью – 133,6 кв. м, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (Кондитерский цех), наименование – кондитерский цех, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, д. 16А.

Лот № 16332 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422382590602000378 площадью 0,1311 га (назначение – обслуживание кондитерского цеха).

Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав в использовании.

**Начальная цена продажи – 7 017,32 руб.** (семь тысяч семнадцать белорусских рублей 32 коп.) с учетом НДС. Сумма задатка – 701,73 руб. (семьсот один белорусский рубль 73 коп.).

**Дата и время начала электронных торгов: 13.04.2020 11.54.**

**Дата и время завершения электронных торгов: 13.05.2020 10.54.**

**Электронный адрес лота:** https://torgi.gov.by/lot/18308/3014/zdanie-konditerskogo-ceha-g-p-kozlovshina-dyatlovskogo-r-na

**АУКЦИОН № 3015, ЛОТ № 18309**

- капитальное строение с принадлежностями, инвентарный номер 451/С-12988, площадью – 50,2 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание бара, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, Козловщинский с/с, г. п. Козловщина, ул. Ленина, д. 50;
- Капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15744, протяженностью 22,1 м, целевое назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, Козловщинский с/с, г. п. Козловщина, ул. Ленина, д. 50, – канализационная сеть к зданию бара;
- капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15743, протяженностью – 24,6 м, целевое назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, Козловщинский с/с, г. п. Козловщина, ул. Ленина, д. 50, – водопроводная сеть к зданию бара.

Лот № 16324 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422355700002000094, площадью 0,0120 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли).

Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав в использовании.

**Начальная цена продажи – 9 087,36 руб.** (девять тысяч восемьдесят семь рублей 36 коп.) с учетом НДС. Сумма задатка – 908,74 руб. (девятьсот восемь рублей 74 коп.).

**Дата начала электронных торгов: 13.04.2020 12.15.**

**Дата и время завершения электронных торгов: 13.05.2020 11.15.**

**Электронный адрес лота:** https://torgi.gov.by/lot/18309/3015/zdanie-bara-vodoprovodnaya-i-kanalizacionnaya-seti-g-p-kozlovshina

**Продавец** – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел. 8 (01563) 64581**

**Организатор аукционов** – Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел. 8 (017) 200 73 33**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.

Победитель аукциона (либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан возместить затраты продавцу на проведение аукциона в течение 3 календарных дней со дня окончания торгов.

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 календарных дней с момента окончания торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора.

Расчетный счет для перечисления задатка: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109 ОКПО: 37533622, Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:**

ЛОТ № 1: **здания административно-хозяйственные** *(составные части и принадлежности: цокольный этаж, крыльцо)* **с инв. № 610/С-57979, общей площадью 439 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887403601000302 (право аренды по 02.02.2113) площадью 0,4633 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Житьково, ул. Новая, 15А.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0213 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0249 га; водоохранная зона водных объектов, пл. 0,4186 га; прибрежная полоса водных объектов, пл. 0,0447 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 65 148,66 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **6 514,00** бел. руб.)

ЛОТ № 2: **комплекса зданий и сооружений «Тепличный комбинат», расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620887408101000475 (право аренды по 29.03.2035) площадью 13,4555 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Пчельник, ул. Советская, 1И,** в составе:
- **тепличный комбинат** *(составные части и принадлежности: административное здание, бойлерная, теплицы)* **с инв. № 610/С-61921, общей площадью 23 914 кв. м;**
- **административное здание (проходная)** *(составные части и принадлежности: площадки и проезды, два ограждения)* **с инв. № 610/С-61932 общей площадью 127,9 кв. м;**
- **весовая с инв. № 610/С-61928 общей площадью 64,7 кв. м;**
- **пункт техобслуживания техники с инв. № 610/С-61930, общей площадью 122,3 кв. м;**
- **стекольная с навесом для хранения минеральных удобрений** *(составные части и принадлежности: пристройка)* **с инв. № 610/С-61926 общей площадью 244,2 кв. м;**
- **склад удобрений, ядохимикатов с инв. № 610/С-61931, общей площадью 348,6 кв. м;**
- **сети водопровода с инв. № 610/С-61924, протяженностью подземной прокладки 1614 м;**
- **сети канализации с инв. № 610/С-61923, протяженностью подземной прокладки 401,93 м;**
- **водонапорная башня с инв. № 610/С-61922, общей площадью 9 кв. м.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона электрических сетей, пл. 0,5185 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, пл. 0,3080 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 648 813,26 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **64 881,00** бел. руб.)

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона по лоту № 1, 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона по лоту № 2. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **18.05.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.05.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНН 600134365

На слыху

# КОЛЬКАСЦЬ ПРАВЕДЗЕНЫХ ТЭСТАЎ НА COVID-19 РАСЦЕ

## Павялічваецца і колькасць лабараторый — іх ужо 24

**З пачатку ўспышкі ў Беларусі зарэгістравана 3728 чалавек з каранавіруснай інфекцыяй. З іх 68 маюць патрэбу ў штучнай вентыляцыі лёгкіх, памерла 36 пацыентаў з шэрагам хранічных хвароб і выяўленым COVID-19.**

На ўчарашні дзень у краіне праведзена 76 198 тэстаў на каранавірусную інфекцыю. Штодзень іх выконваецца цяпер звыш 4 тысяч. Як паведаміў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК** падчас брыфінгу па выніках візіту місіі СААЗ, колькасць лабараторый па дыягностыцы COVID-19 будзе расці. І калі ў суботу тэсты выконвалі 13 лабараторый, то ў аўторак ужо 17, а на ўчарашні дзень — 24. Яны адкрыты як у рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах і цэнтрах гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, так і ў прыватных медыцынскіх цэнтрах.

Павелічэнне колькасці выпадкаў COVID-19 **намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН** звязала з павелічэннем колькасці тэстаў.

— Калі мы праводзілі тысячу тэстаў у суткі, было 8-10 % станоўчых вынікаў. Сёння мы праводзім 4 тысячы і маем тыя ж 10 % станоўчых, — заявіла намеснік міністра. Яна адзначыла, што, паводле прагнозаў, у наступныя дватры тыдні кожныя суткі будзе рэгістравацца па 300-400 новых выпадкаў.

### Хто можа знаходзіцца ў самаізаляцыі?

Улічваючы сітуацыю з павелічэннем колькасці хворых у стацыянарах, кантакты першага ўзроўню, а таксама хворыя з пацверджаным дыягназам, у якіх інфекцыя працякае ў лёгкай форме, могуць заставацца дома пры ўмове наяўнасці адпаведных умоў, такіх як асобны пакой, асабісты посуд, ручнікі, пасцельная бялізна і прадметы гігіены, адсутнасць у кватэры ці доме пажылых людзей. Пры перамяшчэнні па кватэры варта выкарыстоўваць медыцынскую маску і пальчаткі або дакранацца да паверхняў (дзвярных ручак, кранаў і іншых механізмаў санітарна-тэхнічнага абсталявання) з дапамогай аднаразовай сурвэткі.

### Што рабіць, калі стан пагаршаецца?

Да тых хворых, хто знаходзіцца ў самаізаляцыі з нагоды COVID-19, будзе выязджаць брыгада медыкаў тры разы: на першы, сёмы і трынаццаты дзень. Спецыялісты абавязкова возьмуць мазкі. Акрамя таго, штодзённа ўрач участковай службы будзе тэлефанаваць пацыенту, цікавіцца станам яго здароўя і даваць рэкамендацыі. У выпадку пагаршэння, напрыклад пры развіцці задышкі ці павышэнні тэмпературы больш за 37 градусаў, пацыент павінен звязацца з паліклінікай ці патэлефанаваць у хуткую дапамогу, паведаміць, што ён з'яўляецца хворым ці кантактам першага ўзроўню, і расказаць, што яго непакоіць. Пры неабходнасці чалавека шпіталізуюць у стацыянар для далейшага абследавання і лячэння.

У выпадку пагаршэння стану па прычынах, не звязаных з COVID-19 ці вострым рэспіраторным захворваннем (павышэнне артэрыяльнага ціску, боль у сэрцы, болі ў жываце і іншае) выклік брыгады хуткай дапамогі ажыццяўляецца ў звычайным парадку, удакладняльныя пытанні задасць фельчар па прыёме і перадачы выклікаў хуткай медыцынскай дапамогі.

### Як выклікаць урача на дом?

Калі пацыенту без пацверджанага дыягназу COVID-19 неабходна выклікаць урача на дом (з сімптомамі ВРВІ, абвастрэннем хранічнага захворвання, для карэкціроўкі лячэння ці з іншай нагоды), трэба патэлефанаваць у рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр паліклінікі. Медыцынскі рэгістратар ці супрацоўнік кол-цэнтра абавязкова ўдакладніць прычыну звароту, наяўнасць сімптомаў ВРВІ ці грыпу і кантактны тэлефон, а таксама спытае, ці ёсць патрэба ў выпісцы рэцэпта (у выпадку звароту па прычыне абвастрэння хранічнага захворвання).

Затым прымаецца рашэнне аб парадку аказання медыцынскай дапамогі ў канкрэтнай сітуацыі: наведванне паліклінікі, візіт урача ці памочніка ўрача на дом, выклік брыгады хуткай медыцынскай дапамогі — пра гэта пацыента інфармуюць па тэлефоне. Пацыентам з хранічнымі захворваннямі, якія адносяцца да групы рызыкі, арганізавана дастаўка на дом рэцэптаў на лекавыя сродкі для працягу лячэння.

**Алена КРАВЕЦ.**

Спорт

# Беларускія спартсмены выказалі падтрымку ўрачам

**Словы падзякі ад алімпійскага чэмпіёна і прызёраў міжнародных турніраў апублікаваныя на афіцыйным сайце Міністэрства спорту і турызму краіны.**



«Цяпер вельмі важна ўсім нам згуртавацца, перацярпець, перачакаць гэтыя няпростыя часы, і з новымі сіламі заняцца любімай справай», — сказаў **чэмпіён Алімпійскіх гульняў 2016 года батутыст Уладзіслаў ГАНЧАРОЎ.** Ён выказаў падтрымку беларускім урачам, якія мужна змагаюцца з інфекцыяй. «Хачу пажадаць душэўных і фізічных сіл нашым медыкам. Іх роля цяпер першарадная. Але і ад кожнага з нас таксама шмат залежыць. Неабходна выконваць меры бяспекі, па магчымасці трымацца адно ад аднаго на адлегласці, клапаціцца не толькі пра сябе і сваіх блізкіх, але і пра навакольных людзей», — падкрэсліў Ганчароў. «На мой погляд, важна заставацца пазітыўным чалавекам, не заганяць сябе ў дэпрэсію», — адзначыў ён.



**Уладальніца залатой узнагароды II Еўрапейскіх гульняў кідальніца кап'я Таццяна ХАЛАДОВІЧ** адзначыла, што спартсмены працягваюць падрыхтоўку да летняй Алімпіяды, кожны дзень выконваючы вялікі аб'ём работы. Але, на яе думку, урачам і медсёстрам цяпер куды больш складана. «Яны на перадавой, ад іх прафесіяналізму, чалавечых якасцяў цяпер вельмі шмат залежыць. Мне здаецца, трэба не турбаваць іх па дробязях, падтрымліваць словам і справай. І ні ў якім разе не панікаваць. Упэўнена, мы справімся з гэтай інфекцыяй», — сказала Таццяна.



«У боксе бывае так, што калі ты апускаеш рукі — прапускаеш самы цяжкі ўдар. Цяпер такая сітуацыя, што нам ні ў якім разе нельга здавацца і апускаць рукі», — адзначыў **чэмпіён II Еўрапейскіх гульняў баксёр Дзмітрый АСАНАЎ.** На яго думку, кожны чалавек павінен адказна ставіцца да свайго здароўя, прытрымліваючыся рэкамендацый урачоў, — выконваць правілы асабістай гігіены, трымаць дыстанцыю, але пры гэтым не закідваць фізкультуру і спорт.

Тым часам, трэніровачны збор хакеістаў нацыянальнай каманды Беларусі завершаны датэрмінова. Планавалася, што ён будзе доўжыцца да 30 красавіка, але ў сувязі з эпідэміялагічным становішчам кіраўніцтва Беларускай федэрацыі хакея прыняло рашэнне спыніць збор з 15 красавіка. Хакеісты нацыянальнай каманды працягнуць падрыхтоўку да алімпійскай кваліфікацыі ў індывідуальным рэжыме па планах трэнерскага штаба Міхаіла Захарава. Нагадаем, фінальная частка кваліфікацыі да пекінскай зімовай Алімпіяды-2022 намечана на жнівень 2020 года. Беларусы будуць сапернічаць з гаспадарамі турніру — славакамі, а таксама з хакеістамі Аўстрыі і Польшчы.

Беларуская федэрацыя гандбола прыняла шэраг рашэнняў па далейшым правядзенні чэмпіянату і Кубка Беларусі. Вырашана, што чэмпіянат краіны сярод мужчынскіх камандаў у першым дывізіёне працягнецца ў адпаведнасці з зацверджаным календаром. Чэмпіянат сярод жаночых камандаў у групе А прыпынены да 9 мая. Даты правядзення перанесеных матчаў будуць узгоднены і даведзены да кіраўніцтва клубаў пазней. «Фіналы чатырох» Кубка Беларусі сярод мужчынскіх і жаночых камандаў пераносяцца. Новыя тэрміны іх правядзення будуць паведамлены дадаткова.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Будзь у курсе!

# Пасажыраў цягнікоў рассадзяць радзей

**З 15 да 29 красавіка праязныя дакументы на цягнікі фарміравання Беларускай чыгункі з нумараванымі месцамі будуць афармляцца з выкарыстаннем новай схемы рассаджвання ў вагонах.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, рассаджванне па новай схеме з'яўляецца часовай мерай, якая дасць магчымасць пасажырам вытрымліваць неабходную сацыяльную дыстанцыю ў купэйных, плацкартных вагонах і ў вагонах з месцамі для сядзення, рэкамендаваную Міністэрствам аховы здароўя ў сувязі з неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыяй.

Згодна з новай схемай рассаджвання, у купэйных вагонах будуць размяшчацца не больш за два пасажыры ў купэ, у плацкартных — не больш за тры ў адным адсеку. Для пасажыраў, якія аформілі праязныя дакументы ў адной замове, дазваляецца продаж і 3 і 4 месцаў у купэ пры ўмове, што да гэтага ў ім ніводнага месца не было прададзена.

Пры афармленні праязных дакументаў у вагоны з месцамі для сядзення схема рассаджвання пасажыраў залежыць ад іх канфігурацыі — 2+2 ці 3+2. У двухмесным радзе пасажыр займае месца каля акна, у трохмесным — адзін пасажыр каля акна, а другі — праз месца каля праходу (сярэдні рад застаецца свабодны).

Новая схема рассаджвання выкарыстоўваецца пры афармленні праязных дакументаў як у чыгуначных касах, так і праз інтэрнэт.

Калі білеты былі набыты да ўвядзення новай схемы рассаджвання, пасажыры займаюць месцы згодна з афармленым праязным дакументам.

Як таксама заўважылі ў прэс-цэнтры магістралі, з 14 красавіка продаж праязных дакументаў у цягнікі, прычапныя і бесперасадачныя вагоны міжрэгіянальных ліній фарміравання Беларускай чыгункі часова будзе ажыццяўляцца не раней чым за 20 сутак да адпраўлення цягніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Разам

# Медыцынскае абсталяванне ад вайскоўцаў

**Міністэрства абароны Беларусі выдзеліла медыцынскае абсталяванне для тых устаноў аховы здароўя, дзе атрымліваюць дапамогу хворыя з каранавірусам. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ваеннага ведамства.**

Такім чынам, у бальніцы паступілі дадатковыя апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх і спецыяльныя кіслародна-інгаляцыйныя станцыі. Яны асабліва каштоўныя тым, што кожная з іх дазваляе падтрымліваць пры дапамозе кіслароду адначасова да 20 пацыентаў.

Але як з эпідэміялагічнай абстаноўкай у саміх Узброеных Сілах?

— Пэўныя захады прыняты. Часова абмежаваны звальненні і наведванні ваеннаслужачых, — расказалі ў Міністэрстве абароны. — Гэта закранула і мерапрыемствы, звязаныя з перамяшчэннем воінскіх падраздзяленняў. На кантрольна-прапускных пунктах воінскіх часцей пачалі работу медыцынскія пасты. Усе вайскоўцы кантрактнай службы і грамадзянскі персанал штодня перад уваходам на тэрыторыю часці праходзяць агляд. Пры неабходнасці ім вымяраюць тэмпературу.

І канешне ж, пад асаблівай увагай — удзельнікі маючага адбыцца парада.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Справы духоўныя

# ПАБУДЗЬЦЕ ДОМА З БЛІЗКІМІ

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі заклікаў вернікаў у гэтыя дні ўстрымацца ад наведвання храмаў.

«Мы заклікаем сёння вернікаў устрымацца ад наведвання храмаў. А калі вы прыходзіце, то, калі ласка, захоўвайце дыстанцыю адно ад аднаго, — сказаў мітрапаліт. — Храмы зачыняцца не будуць, там будуць здзяйсняцца набажэнствы. Але мы просім: устрымайцеся, застаньцеся дома. Паверце, ад гэтага будзе больш карысці і вам, і вашым блізкім».

Асвячэнне велікоднай трапезы будзе арганізавана на вуліцы каля царквы. «Кулічы і пасхі будуць асвячацца на вуліцы, за межамі храмаў. Мы заклікаем усіх у гэтыя дні маліцца дома. Тым больш што набажэнствы будуць трансліравацца па тэлеканалах», — падкрэсліў мітрапаліт Павел.

Ён таксама парэкамендаваў устрымацца ад наведвання могілак на Радаўніцу.

Далучыцца да святочнага набажэнства, не выходзячы з дома, можна будзе, проста ўключыўшы тэлевізар. На канале «Беларусь 1» 18 красавіка трансляцыя са Свята-Духава кафедральнага сабора пачнецца ў 23.45. А ранкам у нядзелю на тым жа канале ў 6.15 выйдзе ў эфір Слова мітрапаліта Паўла на Светлае Хрыстова Уваскрэсенне.

# НЕ САМЫ ЧЫСТЫ ТАВАР...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спецыялісты ў галіне гігіены адзначаюць, што любыя прадметы або субстанцыі, пры ўзаемадзеянні з якімі ўзнікае рызыка заражэння, адносяцца да класа фамітаў (фаміты — прадметы або субстанцыі, што ўтрымліваюць патагенныя мікраарганізмы, пры судакрананні з якімі ўзнікае рызыка заражэння). Грошы — іх яркі прадстаўнік. Да фамітаў таксама адносяць прадметы ў месцах агульнага карыстання, грамадскім транспарце, медустановах, месцах з вялікай колькасцю людзей. Напрыклад, фамітамі з'яўляюцца поручань у метро і ручка ўваходных дзвярэй у паліклініцы.

## Што «жыве» на купюрах або пластыкавых картках?

Часцей на каштоўных паперах і іншых сродках аплаты можна сустрэць мікрафлору, ідэнтычную той, што жыве на нашых руках або ў поласці рота. Рукамі мы дакранаемся да грошай. А вось з рота мікрачасцінкі сліны пры размове, кашлі альбо чханні трапляюць адразу на грошы, або на рукі, а потым на ўсё, да чаго мы дакранаемся. Такі кругаварот вірусаў у прыродзе.

Трохі радзей на папяровых, металічных і пластыкавых сродках аплаты можна сустрэць неўласцівыя ім «жыхароў» (напрыклад, мікробы хатніх жывёл) і рэшткі усялякіх рэчываў.

Даследчыкі кажуць, што на грашовых знаках жывуць разнастайныя вірусы, бактэрыі (каля 500 відаў: стафілакокі, сальманелы і многія іншыя), плесневые грыбкі, яйкі гельмінтаў. Словам, на грошах адначасова ўжываюцца ўзбуджальнікі розных інфекцыйных хвароб як бактэрыяльнай, так і вірусной прыроды. Усе гэтыя арганізмы з'яўляюцца ўмоўна-патагеннымі, значыць, небяспека заразіцца ёсць заўсёды, але не ва ўсіх. Усё залежыць ад імунітэту чалавека: чым ён ніжэйшы, тым большая імавернасць атрымаць захворванне. Медыцынская статыстыка ведае не адзін выпадак заражэння людзей праз грошы. Небяспечней за ўсё, не памыўшы рук, пасля судакранання з купюрамі або манетамі паесці або пацерці твар.

## Як доўга мікраарганізмы жывуць на грошах?

Грошы — проста заапарк для інфекцыі. Напрыклад, вірус грыпу, паводле даследаванняў навукоўцаў, жыве на іх да двух тыдняў. Пры гэтым лёгка можна заразіцца грыпам (і іншымі інфекцыйнымі захворваннямі) праз купюры, нават здымаючы іх з банкамата.

А вось бактэрыі могуць існаваць на купюрах яшчэ даўжэй — да двух месяцаў. Папяровыя грошы складаюцца ў асноўным з цэлюлозы, якая з'яўляецца пажыўным асяроддзем для бактэрый. Раней банкнотная папера мела кіслую рэакцыю, а цяпер, з развіццём новых тэхналогій, — нейтральную, што спрые большай выжывальнасці бактэрый і грыбоў і развіццю малых



мікрасветаў на асобна ўзятых купюрах.

На металічных манетах і пластыкавых картках тэрмін жыццядзейнасці нябачных арганізмаў значна карацейшы. Але навукоўцы ўпэўнены ў магчымасці адаптацыі мікробаў і да гэтых умоў існавання. А вось наяўнасць у саставе манет высакародных металаў (золата, серабра) зніжае час існавання патагенных арганізмаў на іх паверхні.

Грошы, якія знаходзяцца ў абарачэнні, пастаянна атрымліваюць новыя папаўненні мікробаў — адны «жыхары» саступаюць месца іншым. І кожны з нас робіць унёсак у біяразнастайнасць. Але і гэта яшчэ не ўсё: калі наяўныя грошы цесна судакранаюцца паміж сабой, таксама адбываецца ўзаемаабмен бактэрыямі, грыбамі і вірусамі. І чым больш тэрмін кантакту, тым больш працэнт пераносу.

Самымі чыстымі купюрамі лічаць еўра, таму што яны пакрытыя спецыяльным антыбактэрыяльным растворам. Дарэчы, найбольш бяспечнымі лічацца пластыкавыя банкноты.

Даказана, што найбольш забруджаны папяровыя грошы найменшага наміналу, бо яны праходзяць праз большую колькасць рук. Гэта 1 долар, 50 расійскіх рублёў, 5 і 10 беларускіх рублёў і іншыя.

## Каранавірус на грашах таксама жыве?

Так. Ужо амаль дакладна вядома, што гэты вірус жыве на розных паверхнях. У паветры ён жыццяздольны да 3 гадзін, на медзі — да 4 гадзін, на кардоне — да 24 гадзін, на сталі — да 3 сутак, на банкаўскіх картках — да 9 сутак, а на папяровых грашах — да 14 сутак.

Медыкі даўно ўжо распрацавалі меры прафілактыкі заражэння інфекцыямі праз грашовыя сродкі. Яны раяць пасля кожнага кантакту з грашыма і іншымі «фінансавымі» фамітамі (банкаўскімі карткамі, банкаматамі і інфакіёскамі) старанна мыць рукі. Калі няма магчымасці памыць рукі цёплай вадой з мылам, варта праціраць іх сурвэткамі са спіртазмяшчальным антысептычным сродкам.

Якія яшчэ меры можна зрабіць? Захоўвайце грашовыя сродкі ў кашальках або партманетах, але не ў кішэнях. Таксама недапушчальнае іх судакрананне з прадуктамі харчавання.

Калі без наяўных не абысціся, не спрабуйце абеззаразіць іх у мікрахвалёўцы — грошы проста згараць. Паспрабуйце стары бабулін спосаб — прагладзіць купюры гарачым (але не вельмі) прасам. Ёсць звесткі, што пры тэмпературах звыш 70 градусаў вірус гіне досыць хутка.

Банкаўскія карткі пасля іх выкарыстання можна акуратна (без фанатызму) апрацаваць антысептыкам. Не змяшчайце ў раствор усю карту і не мачыце ім чып і магнітную палоску — картка можа сапсавацца.

А найбольш бяспечна выкарыстоўваць альтэрнатыўныя і бескантактавыя метады аплаты тавараў і паслуг: Samsung Pay, Apple Pay, Garmin Pay; бескантактавыя банкаўскія карткі; інтэрнэт-плацяжы; электронныя грошы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ❍ У ТЭМУ

### Не даваць картку ў чужыя рукі

Нацбанк папрасіў банкі вырашыць пытанне з устаноўкай плацежных тэрміналаў, якія знаходзяцца ў іх на эквайрынгавым абслугоўванні, у арганізацыях гандлю і сэрвісу. Рэгулятар тлумачыць, што ва ўмовах напружанай эпідэміялагічнай сітуацыі сталі пастаянна звароты пакупнікоў, якія скардзіліся на тое, што ім даводзіцца перадаваць карткі ў рукі касіру, каб зрабіць аплату.

У лісце, які фінансавы рэгулятар накіраваў у банкі, адзначаецца, што ў некаторых арганізацыях гандлю і сэрвісу плацежныя тэрміналы ўстаноўлены так, што «трымальнікі бескантактавых картак у момант здзяйснення аплаты не могуць самастойна прыкласці картку да плацежнага тэрмінала і вымушаныя перадаваць яе ў рукі работніку».

«У сувязі з пагрозай распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі COVID-19 просім правесці работу з абсталяваннем арганізацый гандлю і сэрвісу ў частцы забеспячэння зручнага размяшчэння плацежных тэрміналаў — якое дазволіць пакупнікам у момант здзяйснення аплаты самастойна прыкладаць бескантактавыя карткі да плацежнага тэрмінала», — гаворыцца ў лісце рэгулятара.

Нагадаем: банкі рэкамендуюць беларусам скараціць выкарыстанне наяўных грошай на карысць дыстанцыйнай аплаты тавараў і паслуг. Некаторыя і зусім раяць устрымацца ад аплаты гатоўкай.

Мы ўжо пісалі, што цяпер уся грашовая наяўнасць, якая паступае ў Нацыянальны банк, першапачаткова змяшчаецца на 14-дзённы каранцін.

«Затым ажыццяўляецца сартаванне банкнот і манет па ступені забруджанасці і зносу, пасля якой назад у абарачэнне выдаюцца толькі чыстыя і без якіх-небудзь пашкоджанняў банкноты і манеты, а па нізкіх наміналах банкнот (5 і 10 рублёў) у абарачэнне выдаюцца пераважна новыя. Пры гэтым варта ўлічваць, што колькасць грашовай наяўнасці, якая выпускаецца з Нацыянальнага банка штомесяц, складае невялікую долю ўсёй наяўнасці, якая знаходзіцца ў абароце», — растлумачылі ў Нацбанку.

Рэгулятар звяртае ўвагу на тое, што «пасля кантакту нават з адносна чыстымі банкнотамі і манетамі неабходна выконваць традыцыйныя правілы гігіены».

### З асабістага вопыту

У кожнага дарослага жыхара сталіцы цяпер ёсць даволі важкі пачак розных картак. Гэта пластыкавы пропуск на работу, шматразовы праязны білет, банкаўская картка, карткі лаяльнасці гандлёвых сетак і шмат іншага. Дык вось, усё гэта спрацоўвае (амаль заўсёды) без жывога дотыку да другога прадмета кантакту. У метро, напрыклад, дастаткова паднесці картку да валідатара на адлегласць адзін—пяць сантыметраў. Або, на ўсякі выпадак, мець у кішэні спецыяльную сурвэтку...

белагропромбанк
www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2020 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.04.2020 | 01.01.2020 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 228 948 | 230 165 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 315 | 275 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 042 083 | 762 997 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 537 393 | 225 806 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 322 706 | 3 028 958 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 6 934 443 | 6 084 854 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 1 | 465 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 142 289 | 142 289 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 263 717 | 265 728 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 222 | 224 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 8 319 | 8 348 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 75 634 | 73 581 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 12 556 070 | 10 823 690 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 2 391 140 | 1 728 004 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 7 327 182 | 6 369 680 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 1 028 153 | 901 489 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 49 | 189 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 1 964 | 1 964 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 56 682 | 48 743 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 10 805 170 | 9 050 069 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 1 238 352 | 1 238 352 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 45 579 | 32 329 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 107 273 | 132 753 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 359 696 | 370 187 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 750 900 | 1 773 621 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 12 556 070 | 10 823 690 |

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь – март 2020 года**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.04.2020 | 01.04.2019 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 181 189 | 166 995 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 93 394 | 81 920 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 87 795 | 85 075 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 58 332 | 45 996 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 20 266 | 12 919 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 38 066 | 33 077 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 49 | 39 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 2 772 | 204 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 26 390 | 3 728 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 819 | (375) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 57 827 | 30 054 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 4 105 | 5 754 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 80 034 | 76 532 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 7 532 | 5 657 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 14 603 | 15 259 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | - | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 14 603 | 15 259 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

Председатель Правления А.А. Лысюк

Главный бухгалтер М.А. Шаповалова

Дата подписания: 6 апреля 2020 г.

Финансовая отчетность опубликована на сайте: **https://www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# ЧАС ЧЫСТЫХ РУК

*Сяброўка расказвае: самаізалявалася, то-бок выдалілася з бацькоўскага чата малодшай дачкі. «Я, — кажа, — цярплівы і дастаткова флегматычны чалавек, але ўжо не было больш маральных сіл успрымаць хвалю карысных парад пра тое, як трэба сябе паводзіць у цяперашняй сітуацыі»: «Усе спажывайце імбір, і дзецям давайце — можна ў чай з лімонам і мёдам, модна за шчаку кавалачак класці і так хадзіць», «Лухта ваш імбір і часнок з ім разам, іх трэба было есці значна раней, каб імунітэт падтрымаць, а цяпер — толькі вітамін С, па граме штодня!», «Ну-ну, вы яшчэ змяіны яд парайце. Проста піце шмат цёплай вадкасці і часцей мыйце рукі»... Што самае цікавае, ні ў кога з бацькоў групы, у якую ходзіць дзяўчынка, няма медыцынскай адукацыі, але чамусьці яны ўпэўненыя, што дастаткова патраціць паўгадзіны на чытанне і прагляд розных інтэрнэт-крыніц (без фільтрацыі, адкуль узяты тыя ці іншыя звесткі і ці можна ім давяраць), і з дапамогай «гугла ўсемагутнага» ты будзеш ведаць столькі ж, а мо і больш, чым урачы, якія бессэнсоўна праседжвалі штаны і спадніцы шэсць гадоў ва ўніверсітэце...*

*Тое самае адбываецца ў бацькоў: такое адчуванне, што большасць актыўных пенсіянераў, якія засвоілі «Вайбер» і іншыя месенджары, толькі і занятыя тым, што перасылаюць адно аднаму то страшылкі, то малітвы, то сакрэтныя «дзейсныя рэцэпты супраць каранавіруса», з немаведама якіх грымуараў пачэрпнутыя. Даводзіцца рэгулярна нагадваць, што «адна бабка сказала» і «калега мужа стрыечнай сястры» — не СМІ і нават не блогеры, а такія сабе сучасныя аналагі пляткарніц на лавачках, і найлепшае, што можна зрабіць для ўласнага здароўя, — прапускаць іхнія размовы міма вушэй.*

*Але ёсць і прыемная акалічнасць у гэтым інфармацыйным бурленні. Ці звярнулі вы ўвагу, што тэлефонныя і асабістыя размовы цяпер часта завяршаюцца не індыферэнтна-безасабовым «пакуль», «ну, усё» ці там «усяго добрага», а цёплым «бывай здаровы», «не хварэйце», «беражыце сябе»? Гэта нібыта своеасаблівы маркер — мне насамрэч не ўсё роўна, шаноўныя суразмоўцы, як вашы справы, я за вас хвалююся і зычу здароўя...*

*Штодня даводзіцца бачыць, чуць, пісаць пра дабрачынныя акцыі і забаўныя флэшмобы, пра добрыя прыклады дапамогі, падтрымкі, клопату адных людзей пра іншых. І калі гэта хоць крыху зменшыць агульны ўзровень трывожнасці і стрэсу (які, між іншым, таксама ўплывае на здароўе) — ужо нядрэнна.*

*І ўсё ж адказнасць за здароўе і жыццё кожнага з нас, канешне, перадусім на нас саміх. Калі вам дапамагае ці проста супакойвае прымяненне нетрадыцыйнай медыцыны, народных сродкаў і замоў — калі ласка, карыстайцеся. Аднак не трэба несці гэтыя сакральныя веды шырокаму колу слухачоў і падмяняць імі сцíслыя, простыя, пры гэтым вельмі важныя рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Скарацíце колькасць кантактаў, пры магчымасці і неабходнасці самаізалюйцеся дома, а «ў людзях» вытрымлівайце сацыяльную дыстанцыю, карыстайцеся антысептыкамі, насіце маскі ў рэкамендаваных сітуацыях, старанна мыйце рукі — словам, выконвайце ўвесь той комплекс мер, які цяпер трапна называюць гігіенічным этыкетам. І будзьце здаровыя. Калі ласка.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Сямейная газета

Выпуск № 8 (144)

Тыя, хто побач

## Спявак Аляксандр ПАТЛІС:

# «Пасля цярпення вучымся доўгацярпенню»



Агульнасямейнае фота: Аляксандр і Тацццяна ПАТЛІСЫ з сынам, дачкой і яе мужам.

**КАЛІ пісаць біяграфію Аляксандра Патліса мовай лічбаў, сярод іх будуць такія: 49-гадовы музыкант і спявак, мае на творчым рахунку звыш 1000 канцэртаў у складзе хрысціянскага рок-гурта «Новы Іерусалім», адыграных як у Беларусі, так і ў блізкім і далёкім замежжы, восем альбомаў з гуртом і два сольныя пасля сыходу з яго, пастаўлены ў 2004-м рэкорд у нацыянальным хіт-парадзе — 9 месяцаў абсалютнай папулярнасці песні «Любоў у далонях». А яшчэ каханая жонка Тацццяна, з якой яны разам без малога 30 гадоў, і двое дзяцей з вялікай розніцай ва ўзросце: старэйшай Настассі 28 гадоў, яна ўжо замужам і жыве асобна, а сыну Лявону толькі сем. Менавіта пра дзяцей і пра тое, як з узростам мяняюцца разуменне бацькоўства і выхаваўчыя метады, «СГ» пагутарыла з музыкантам.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Урокі выхавання

# БЫЦЬ ТАТАМ — РОЛЯ ДРУГОГА ПЛАНА?

**Ёсць выслоўе, што лёгка стаць бацькам, але складана быць татам. І ў жыцці, на жаль, не кожнаму дзіцяці шанцуе расці ў поўнай сям'і. Але ж мы добра разумеем, што наяўнасць мамы і таты — гэта той мінімум, на якім грунтуецца ўсё: фарміраванне асобы, наша стаўленне да саміх сябе і да тых, хто побач з намі. Вядома, усведамленне гэтых простых ісцін прыходзіць з узростам. Аднак з самага маленства мы адчуваем, як цёпла і надзейна, а таксама цікава і весела, калі побач абодва бацькі.**

Калі важнасць маці для дзіцяці не выклікае сумненняў (бо яна крыніца жыцця — нараджае, корміць, даглядае і г. д.), то роля таты часам трапляе ў цень. Але яго ўнёсак у фарміраванне новага чалавека не менш важны. Нездарма імя па бацьку як дадатак да імені абазначае, чый ты. Здаўна лічылася, што бацька ў сям'і — гэта галоўны чалавек, які задае яе кірунак і правілы жыцця. Так у ідэале, а на практыцы атрымліваецца па-рознаму.

Бывае, людзі бяруць шлюб па каханні і з гатоўнасцю несці адказнасць адно за аднаго і за сваіх будучых дзяцей. І тады мы маем адзін сцэнарый, дзе дзеці бачаць, што такое сям'я. Зусім іншая карціна атрымліваецца, калі жанчына з розных прычын застаецца адна з дзіцем. Сёння многія імкнуцца быць незалежнымі і дэманстраваць «усё сама», таму ім здаецца, што нарадзіць, забяспечыць сябе і дзіця фінансава можна і без бацькі. Аднак, перш чым рабіць гучныя заявы, давайце разбяромся, для чаго ён патрэбны.

Часам стэрэатыпна лічыцца, быццам задача мужчыны, калі ён становіцца бацькам, — забяспечваць жонку і дзяцей. Але на самой справе бацька — гэта, перш за ўсё, мадэль мужчынскіх паводзін у сям'і, якая патрэбна дзіцяці. Напрыклад, псіхолагі адзначаюць, што ва ўзросце ад года да пяці, калі ў малога фарміруецца характар, вельмі важна, каб яму было зразумела, хто ў доме галоўны. Таму трэба дакладна разумець з самага пачатку з'яўлення дзіцяці, хто і за што адказны ў адносінах да яго.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

# Вы даглядаеце інваліда ці пажылога чалавека...

**На якую дапамогу ад дзяржавы могуць разлічваць такія людзі? Якія ўмовы пры гэтым павінны быць выкананыя? Ці ўваходзіць час догляду інваліда I групы або старога, які дасягнуў 80 гадоў, у страхавы стаж? Адказы чытайце ніжэй.**

**Хто мае права на дапамогу ў сувязі з ажыццяўленнем догляду інваліда I групы або старога, які дасягнуў 80 гадоў?**

У адпаведнасці з заканадаўствам, права на такую дапамогу маюць асобы, якія ажыццяўляюць пастаянны догляд інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80 гадоў, гэта значыць аказваюць інваліду ці старому чалавеку дапамогу ў тым, што датычыцца асабістай гігіены, адзявання, прыёму ежы, ажыццяўлення фізіялагічных адпраўленняў і іншых патрэб, неабходнасць у задавальненні якіх узнікае адзін і больш разоў у суткі.

Што датычыцца асобы, старэйшай за 80 гадоў, то павінна быць адпаведнае заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, што такі грамадзянін мае патрэбу ў пастаянным доглядзе.

Пры гэтым чалавек, які ажыццяўляе догляд, павінен: знаходзіцца ў працаздольным узросце, нідзе не працаваць, не займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, не навучацца ў навучальнай установе на дзённай форме навучання. Акрамя таго, такі чалавек не павінен атрымліваць пенсію, дапамогу па беспрацоўі, штомесячную страхавую выплату, штомесячнае грашовае ўтрыманне.

**Які памер гэтай дапамогі?**

Памер дапамогі складае 100 працэнтаў (пры ажыццяўленні догляду двух або больш непрацаздольных асоб — 120 працэнтаў) найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы. З 1 лютага 2020 года памер такой дапамогі складае 239 руб. 87 кап., а пры доглядзе некалькіх непрацаздольных грамадзян — 287 руб. 84 кап.

**Куды звярнуцца па яе прызначэнне?**

Гэтая дапамога прызначаецца раённым (гарадскім) упраўленнем (аддзелам) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства непрацаздольнага грамадзяніна.

Асобе, якая ажыццяўляе догляд, неабходна прадставіць ва ўказаны орган адпаведную заяву, пашпарт і працоўную кніжку. А ў выпадку назначэння дапамогі па доглядзе асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, — заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі аб патрэбе асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, у пастаянным доглядзе.

**Ці з'яўляецца той, хто даглядае інваліда ці пажылога грамадзяніна, работнікам і якія запісы ўносяцца ў яго працоўную кніжку?**

Не, ён не з'яўляецца работнікам, на яго не распаўсюджваецца заканадаўства аб працы і дзяржаўным сацыяльным страхаванні. Грашовая дапамога па доглядзе — гэта мера дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі, а не заработная плата.

У працоўную кніжку грамадзяне, якія даглядаюць інваліда I групы або асобу, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, і атрымліваюць адпаведную дапамогу, уносяцца запісы аб прызначэнні дапамогі па доглядзе і аб спыненні выплаты дапамогі (а не аб прыёме на працу і звальненні).

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

Калі канікулы зацягнуліся

# ІНТЭРНЭТ У ДАПАМОГУ,

## або Ці хавае страус галаву ў пясок?

**Ці ведалі вы, што ў смаўжоў больш за 14 тысяч зубоў, а пры халодным надвор'і яны могуць упасці ў спячку і правесці ў такім стане да трох гадоў без харчавання? А ці казалі вам, што ў марской зоркі няма мазгоў, рот знаходзіцца на ніжнім баку цела і што гэта істота — адзін з рэкардсменаў па колькасці ног (кожны прамень абапіраецца на сотні маленькіх ножак)? А як вам такі факт: калі вы сарвалі адзін рамонак, то насамрэч трымаеце ў руцэ суквецце, якое складаецца з маленькіх жоўтых і аднапялёсткавых белых кветачак? А можа, вы заўсёды думалі, што страусы ад спуду хаваюць галаву ў зямлю?.. Сёння адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні вядомы нават першакласнікам. Ва ўсякім разе, тым, якія пасябравалі з «віртуальнымі» настаўнікамі.**



### НОВЫ СВЕТ

Так, інтэрнэт прапануе сучасным дзецям шмат адукацыйных рэсурсаў. Ён заменіць цэлую бібліятэку: тут можна знайсці творы па школьнай праграме, многа вершаў і казак, загадак, прымавак, біяграфій цікавых людзей, ілюстраваныя энцыклапедыі, даведнікі, слоўнікі, падручнікі.

Сёння нікога ўжо не здзіўляюць віртуальныя экскурсіі па найлепшых музеях і карцінных галерэях свету, спектаклі і канцэрты анлайн. Можна дыстанцыйна гуляць у шашкі, разам з аднакласнікамі праглядзець пэўную перадачу ці нават зрабіць зарадку. Настаўнікі могуць праводзіць анлайн-канферэнцыі са сваім класам альбо рассылаць вучням індывідуальныя заданні.

Пазнавальныя ролікі і мультфільмы растлумачаць, навошта чысціць зубы, як працуе сэрца, як сабраць робата; раскажуць пра разнастайныя вынаходніцтвы.

Створана багата адукацыйных рэсурсаў для дзяцей, на якіх можна вывучаць замежныя мовы, рыхтавацца да любых урокаў (нават па прадмеце «Працоўнае навучанне» — я, напрыклад, натрапіла на сайт для хлопчыкаў, прысвечаны выпільванню лобзікам). Тая ж прафарыентацыя старшакласнікаў, якая «прасела» з-за каранавіруса, — не праблема, тэсты можна прайсці анлайн, а на розных рэсурсах, відэароліках у YouTube атрымаць інфармацыю пра разнастайныя прафесіі. З сайта Smartia.me падлеткі не толькі даведаюцца пра сучасныя спецыяльнасці, але і змогуць крыху паглыбіцца ў іх, развіць у сабе навыкі журналіста, аналітыка, дызайнера, фатографа — тут ёсць заданні, інтэрв'ю і парады спецыялістаў, спасылкі на карысную літаратуру.

Інтэрнэт ужо стаў настаўнікам для самых розных катэгорый: ад дашкольнікаў, якія толькі вучацца чытаць і лічыць, да выпускнікоў, якія рыхтуюцца да паступлення. А сайты, падобныя на Online Test Pad, дапамогуць праверыць веды па розных школьных тэмах, якія могуць быць звязаныя з табліцай множання, пастаноўкай націску ці датамі гісторыі.

Сёння, калі бацькі сталі пакідаць дзяцей дома, многія камерцыйныя адукацыйныя цэнтры перайшлі на дыстанцыйнае навучанне. Аказалася, што дыстанцыйна можна вывучаць не толькі замежныя мовы, матэматыку, хімію, фізіку, праграмаванне, але і вучыцца маляваць, іграць на музычных інструментах і выконваць заданні трэнераў сваіх спартыўных клубаў. А колькі ўсялякіх ідэй для аматараў хэнд-мэйду!

### ДАМАШНЯЕ НАВУЧАННЕ? ЛЁГКА!

Асабіста я не магу зразумець, адкуль такая паніка вакол пытання, што будзе з дзецьмі, калі школы раптам закрыюцца на каранцін. Вы што, ніколі не сядзелі з дзецьмі на бальнічных? Напрыклад, маю шматдзетную сям'ю бясконцыя бранхіты, ангіны і ратавірусы тыднямі закрывалі дома. І на гэты час я ператваралася ў настаўніцу, выхавальніцу і дарадцу. Набірала кніг у бібліятэцы, шукала дапаможнікі і рэсурсы ў інтэрнэце, якія «стыкуюцца» з тэмамі, што дзеці праходзяць у школе. Да таго ж у старэйшых класах дзеці самі выдатна арыентуюцца ў сеціве і ўмеюць шукаць адказы на розныя пытанні.

І сёння бацькі маглі б прыйсці на дапамогу дзецям і настаўнікам — ва ўсякім разе, для пачатковай школы ў сеціве можна знайсці ўсе неабходныя матэрыялы і нават «падсунуць» малым тое, чаго не хапае ў праграме навучальнай установы.

Як многа сёння створана разнастайных інструментаў для навучання дзяцей! Калі ў вас няма гаджэтаў, не забывайцеся пра бібліятэкі і кнігарні. У продажы багата разнастайных дапаможнікаў, тэстаў, зборнікаў з самастойнымі і кантрольнымі заданнямі самага рознага ўзроўню, у тым ліку і для дзетак, у якіх туга ідуць школьныя прадметы, альбо, наадварот, — для алімпіяднікаў. І хоць кажуць, што інтэрнэт перагружаны, гэта не азначае, што віснуць будзе ўсё, некаторыя адукацыйныя платформы ўжо перастроіліся пад узрослыя патрэбы карыстальнікаў.

### ДЗЕТКА, ДАВАЙ!

Ці можа настаўнік планаваць навучанне пад кожнага вучня? Многія бацькі, якія разам з сынамі і дочкамі карпеюць над дамашнімі заданнямі, могуць нядрэнна арыентавацца ў школьнай праграме і тэмах, якія сёння праходзяць іх малыя. Яны ведаюць, якія прадметы дзіцяці горш даюцца, у якіх тэмах яно прабуксоўвае, а дзе магло б скокнуць наперад.

Замест прыкладаў «10+5», якія цяпер рашаюць аднакласнікі, мой першаклашка складае двухзначныя лікі, рашае судоку і какура, пачынае вучыць табліцу множання, спрабуе разабрацца з паслядоўнасцямі, 3D-задачкамі, алгарытмамі на сайце logic.by. Гэты рэсурс добра вядомы беларускім школьнікам. Многія настаўнікі дзякуючы яму рыхтуюць на факультатывах будучых алімпіяднікаў.

Бацькі з усяго свету выкарыстоўваюць бясплатныя курсы Code.org, для таго каб пачаць знаёміць дзяцей з праграмаваннем, прычым тут ёсць заняткі для дашкольнікаў і першых класаў — усё проста, даступна, бацькам, хіба толькі спачатку трэба паказаць, дзе якія клавішы размяшчаюцца на клавіятуры. Малыя хутка разбіраюцца, што да чаго, і далей могуць займацца самастойна.

Ужо распрацавана багата цікавых інтэрактыўных методык, якія лёгка і зразумела падаюць дзецям школьныя прадметы і нават сур'ёзныя навукі, пры гэтым вучням можа здавацца, што яны выконваюць заданні ў чарговай камп'ютарнай гульні. Пачатковы курс матэматыкі для дзяцей, які ўключае ў сябе элементы курса вышэйшай матэматыкі, мы знайшлі на сайце «Дзеці і навука» (childrenscience.ru). Не палянуйцеся зазірнуць на гэтую інтэрнэт-старонку! Напрыклад, на курсе «Навакольны свет. 1 клас» дзеці будуць адзяваць рака-пустэльніка, карміць кляшча і ваўчанят, знаёміцца са сваякамі вераб'я, выбіраць прафесіі для бактэрый і знаходзіць адказы на пытанні накшталт "Ці спяваюць вірусы?», а дапамагаць спасцігаць прадмет дзецям, акрамя настаўніка, будзе аніміраваны персанаж.

### ВІРТУАЛЬНЫЯ НАСТАЎНІКІ

Школа моцна мяняецца. Мой першаклашка атрымлівае веды зусім не так, як яго старэйшы брат, які адвучыўся ў гэтай жа ўстанове ўжо 9 гадоў. На электронную пошту настаўніца дасылае план на тыдзень: бацькі бачаць, якія тэмы дзеці разбіраюць у класе, і рэкамендацыі, што матываваныя вучні могуць зрабіць дома. У дадатак мы атрымліваем тэксты вершаў і апавяданняў, якія пазначаны ў праграме, відэаролікі, прэзентацыі, адсканіраваныя дапаможнікі, спасылкі на карысныя інтэрнэт-рэсурсы. Дзеці толькі за гэты год прайшлі ўжо каля 10-15 дыстанцыйных алімпіяд. І гэта ў першым класе!

Я б магла вам яшчэ многа расказаць пра іншыя рэсурсы, але ў нас ужо чарга на камп'ютар. Спачатку ў дачкі ў Zoom урок карэйскай мовы, пасля малодшы будзе рашаць задачкі на foxford.ru (цяпер у сувязі з каранавірусам рэсурс адкрыў бясплатны доступ да сваіх курсаў), а старэйшаму сыну трэба рыхтаваць прэзентацыю па гісторыі.

...Усе наракаюць, што школа пакуль не гатова да дыстанцыйнага навучання. Сёння настаўнікі вымушаны «наскокам» сабраць, перапрацаваць тое, што ёсць, і выдаць дзецям, якія завіслі на самаізаляцыі, гатовы прадукт. Але хіба такі рэсурс не быў патрэбны раней, яшчэ да каранавіруса? Напрыклад, вучням, якія ад частых хвароб прапускаюць заняткі, альбо тым, хто выбівае з калектыву, — каму трэба больш часу на засваенне тэмы ці, наадварот, таленавітым вучням, якім школьнай праграмы недастаткова? У нас шмат шыкоўных педагогаў, праводзяцца конкурсы на найлепшых настаўнікаў... Калі ж іх вопыт, веды і напрацоўкі будуць прапагандавацца, пашырацца і «пакавацца» ў сучасныя відэаўрокі? Тым больш што для гэтага ёсць даступныя інструменты на інтэрнэт-рэсурсах і падрабязныя відэаінструкцыі, як імі карыстацца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# БЫЦЬ ТАТАМ — РОЛЯ ДРУГОГА ПЛАНА?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

— Мужчына можа быць біялагічным бацькам, але свае функцыянальныя абавязкі, якіх патрабуе сацыяльная роля таты, не выконваць. Абставіны могуць быць розныя — ці ён сам адыходзіць ад іх, ці яму не даюць гэтага рабіць, таму што яго шлюб з маці дзіцяці скасаваны, ці мужчына не жадае падтрымліваць з дзецьмі стасункі. І тады татам ён так і не становіцца. А між іншым, наяўнасць гэтай сацыяльнай ролі вельмі важная для дзяцей. Бо тут праяўляецца здольнасць мужчыны браць на сябе сваю долю адказнасці не толькі ў тым, каб забяспечыць фінансавы дабрабыт малога, але і ў тым, каб выбудаваць з ім уласныя, блізкія і эмацыянальныя адносіны, — кажа **псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Раман КРУЧКОЎ.** — Бяда многіх бацькоў у тым, што яны лічаць: як падрасце малое, тады і пачну ім займацца, выхоўваць.

Дарэчы, Раман Уладзіміравіч з'яўляецца каардынатарам беларуска-шведскага праекта «Тата-школа» — ён ужо не першы год аб'ядноўвае мужчын, якія толькі рыхтуюцца альбо нядаўна сталі татамі. Для іх гэта магчымасць абмяркоўваць свае пачуцці ў новай сацыяльнай ролі і лепш арыентавацца ў тым, як правільна рабіць свой важны ўнёсак у выхаванне дзіцяці.

Выбудоўванне адносін у фармаце «бацька—дзіця» аказвае моцны ўплыў на сталенне сына ці дачкі незалежна ад таго, станоўчы ці адмоўны прыклад яны бачаць перад сабой. Роля бацькі пранізвае ўсе патрэбы дзяцей. У прыватнасці, шматлікія даследаванні даказваюць больш гарманічнае развіццё дзіцяці, калі яно расце ў поўнай сям'і і атрымлівае дастаткова любові і прыняцця ад абодвух бацькоў. Тады ў дзетак з большай імавернасцю фарміруецца станоўчая карціна свету. І, адпаведна, у няпоўнай сям'і, дзе вырашэнне ўсіх праблем ляжыць на жаночых плячах, малое тэарэтычна (і практыка псіхолагаў тое пацвярджае) можа недаатрымліваць увагу, што адбіваецца на эмацыянальнай блізкасці. Таму бацьку варта будаваць свае адносіны з сынам альбо дачкой, а не перакладаць іх толькі на маці сваіх дзяцей.

**Часам стэрэатыпна лічыцца, быццам задача мужчыны, калі ён становіцца бацькам, — забяспечваць жонку і дзяцей. Але на самой справе бацька — гэта, перш за ўсё, мадэль мужчынскіх паводзін у сям'і, якая патрэбна дзіцяці.**

Добры прыклад мужчынскіх паводзін, нават з боку, лепшы, чым увогуле яго адсутнасць. Таты можа не быць побач з дзіцем па розных прычынах — скасавалі шлюб, разышліся, бо мужчына аказаўся не гатовы да новай ролі, альбо наогул ён загінуў. І кожны з варыянтаў ставіць маці перад няпростым пытаннем: як правільна растлумачыць дзіцяці адсутнасць бацькі? Псіхолаг у гэтым выпадку раіць не браць на сябе адказнасць, не падманваць дзіця, бо яно заслугоўвае права ведаць, што адбываецца ў сям'і. Маламу неабходна ўпэўненасць, што яго патрэбы ў бяспецы і блізкасці задавальняюцца, для яго вельмі важная прысутнасць абодвух у яго жыцці.



Мужчына з сына выхоўвае мужчыну, дае яму мадэль паводзін. Хлопчык назірае за бацькам, адзначаючы для сябе, чым той займаецца, як паводзіць сябе з маці і іншымі людзьмі, якімі інтарэсамі жыве. І тое, наколькі вобраз перад яго вачыма адпавядае крытэрыям сапраўднага мужчыны, у многім вызначае, які вырасце сын. Дзяўчынцы бацька дае прыклад таго, як ёй будаваць узаемаадносіны з супрацьлеглым полам. Тата аказвае вялікі ўплыў на самаацэнку дачкі сваёй любоўю і прыняццем яе. Чым мацнейшая сувязь з бацькам, тым большая імавернасць, што ад яго дзеці возьмуць за арыенцір мадэль паводзін у сям'і, вызначацца для сябе з каштоўнасцямі і інтарэсамі. А ўсім астатнім мы абагачаемся ўжо ў працэсе сацыялізацыі.

Калі дзіця не мае перад вачыма прыкладу бацькі, то пачынае прыдумваць для сябе яго вобраз. Шукае яго сярод тых мужчын, якія ёсць сярод родзічаў, настаўнікаў... Трэба знайсці адэкватную ралявую мадэль. Але ўсё ж такі нават у гэтым выпадку губляецца вельмі важная база, якую можа даць толькі бацька. Бо ён — гэта той, хто заўсёды побач, хто абароніць, падкажа. І адносіны дзіцяці з родным і блізкім чалавекам зусім іншыя, больш асабістыя.

Варта памятаць і тое, што вашы дзеці — гэта не спосаб зрабіць балюча іншаму. Па-сапраўднаму дарослыя і псіхалагічна сталыя людзі здольны вырашаць усе пытанні і праблемы паміж сабой, не ўцягваючы ў свае разборкі дзіця. Калі бацька праяўляе ініцыятыву і імкнецца не траціць сувязі з дзецьмі, то падтрымайце яго. Але калі мужчына не жадае быць бацькам, то не марнуйце сілы і час на тое, каб перайначыць дарослага чалавека.

**Алена СПІРЫДОВІЧ, тэлевядучая:**



— Я заўсёды была татава дачка. І мае самыя яркія ўспаміны з дзяцінства — гэта калі я гадзінамі знаходзілася ў бацькавай грымёрцы... Татава грымёрка, гастролі з тэатрам — вось чым я жыла, пакуль іншыя дзеці, напрыклад, летам адпачывалі ў лагеры. Раней была такая традыцыя, што адзін з мінскіх тэатраў ехаў на месяц з паказамі спектакляў у нейкі раённы цэнтр. Там мы жылі ў гасцініцы і вечарамі ездзілі ў саўгасы ці калгасы, дзе трупа давала спектакль. Ці трэба казаць, што я іх усе ведала на памяць і адчувала сябе часткай трупы... Альбо вось яшчэ важны перыяд — падлеткавы ўзрост. Я тады, мабыць, і характар часам праяўляла, аднак у адносінах з бацькам у нас заўсёды былі гармонія і паразуменне. Памятаю, неяк ён сказаў мне: «Мужчыны заўсёды будуць ставіцца да цябе так, як ты ім дазволіш». І я зразумела і менавіта так усё жыццё сябе паводзіла. У мяне ніколі не ўзнікала непаразуменняў з мужчынамі. Такі вось бацькоўскі ўплыў. Я і да сёння татава дачка, і недзе падсвядома па жыцці мне важныя яго аўтарытэт, адабрэнне і давер. Мой бацька для мяне — прыклад неверагоднага аптымізму. Ён спявае, калі ў яго добры настрой. Побач з ім заўсёды толькі добрыя людзі. Бацька не ўмее казаць прыгожых слоў, але яго натуральнасць, шчырасць і адданасць — гэта тое, чым я захапляюся. У яго неверагодная інтуіцыя да праўды, але ён ніколі не асудзіць і не будзе вучыць некага жыць. Я ўсё гэта ведаю, бо гляджу, як ён жыве. Не скажу, што яму ўсё проста давалася, аднак тата ніколі не скардзіўся. Што датычыцца яго адносін з мамай, то тут ён проста знайшоў адзіную жанчыну на ўсё жыццё... І я ведаю, што з бацькам мы зможам пераадолець любыя цяжкасці. Таму вельмі цаню той час, пакуль мы разам.

**Георгій КАЛДУН, тэлевядучы, спявак:**



— Для сябе я выдзяляю некалькі кірункаў, дзе бацька аказаў на мяне вялікі ўплыў. Найбольш прадукцыйны час нашых зносін прыпаў на маё дзяцінства і школьныя гады. Мы заўсёды былі разам. Бацька быў вельмі начытаны, таму менавіта ён фарміраваў мой багаж ведаў і мысленне працяглы час. Я, магчыма, нават на геаграфічны факультэт паступіў таму, што там вучыліся мае бацькі. Вучыцца ў бацькі было заўсёды цікава і весела. Я часта, калі быў маленькі, сядзеў у яго і ў мамы на ўроках. Памятаю, напрыклад, калі дзеці пісалі кантрольную, тата ўключаў ім «Бітлз» на бабіным магнітафоне. І цяпер некаторыя веды — гэта менавіта той яго ўнёсак у мяне... Другі важны для мяне момант — літаратура і пачуццё гумару. Мой бацька шмат чытаў і ўмеў і мяне зацікавіць кнігай. Памятаю, ён сядзеў у пакоі, чытаючы Ільфа і Пятрова, і смяяўся. На маё пытанне, што там смешнага, прапанаваў мне самому даведацца. Я, прачытаўшы некалькі старонак, не адчуў весялосці, а тата мне сказаў: «Няўжо ты думаеш, што будзе весела з першых радкоў?!» Тады я зразумеў: для дасягнення выніку, для разумення сітуацыі заўсёды патрэбны высілкі.

Важны для мяне быў і яго ўплыў у музыцы. Дзякуючы бацьку і яго густу я рос у свеце найлепшых музычных твораў тых часоў. У таты была вялікая фанатэка, і ён умеў знаходзіць і адбіраць лепшае сярод лепшага... Пасля таго як мае бацькі вырашылі разысціся, я застаўся жыць з татам у той жа кватэры. Але падтрымліваў адносіны ў роўнай ступені і з ім, і з мамай. Я не ідэалізую бацьку, бо ў кожнага свае недахопы і моцныя бакі. Але вельмі ўдзячны яму за ўсё, што паспеў узяць ад яго, калі ён быў побач.

**Міхаіл ЗУЙ, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы:**



— Бацька для мяне — гэта словы, парады і веды. Спачатку ты ім супрацьўляешся, спрачаешся, а з часам разумееш перавагу сказанага. Асабіста для мяне тата — той чалавек, на падтрымку і дапамогу якога я магу разлічваць у любой сітуацыі. Менавіта таму я цяпер імкнуся знайсці агульныя інтарэсы з сынам, каб разумець, чым ён жыве і як думае. Гэта дае нам агульныя тэмы для размоў.

Безумоўна, бацька заўсёды аказвае ўплыў на фарміраванне свайго дзіцяці. І адбываецца гэта не праз словы, а праз той прыклад, які мы бачым перад сабой. Можна проста разам праводзіць час і нават не размаўляць, але адчуваць, што вы блізкія людзі. Многім рэчам ты навучышся ў бацькі, таму што ён будзе адзіным прыкладам перад тваімі вачыма. Я сам, паколькі ўжо стаў бацькам, калі-нікалі думаю пра тое, наколькі важныя мае паводзіны, таму што яны ў любым выпадку знойдуць адлюстраванне ў жыцці маіх сына і дачкі... Думаю, што сувязь і тыя адносіны, якія дзіця выбудоўвае з бацькам, ніхто і нішто не можа замяніць. І калі ў гэтым сэнсе ты нейкія рэчы (напрыклад, пахвала, прыняцце цябе такім, які ты ёсць) не атрымліваеш, то потым будзеш шукаць іх у жыцці ў іншых формах. А калі табе хапіла любові і блізкасці, значыць, ты маеш вельмі важны падмурак для жыцця.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з уласных архіваў.**

#яжмаці

# Зубачыстка натхнення

На ранішніках я не вытрымліваю і плачу. Крадком. Бывае, спрабую дамовіцца з сабой, каб не плакаць, — не магу. Я назіраю, як растуць мае дзеці, кожны дзень, але чамусьці менавіта тут усведамляю, наколькі яны выраслі. Выяўляецца ў іх гэта не столькі фізічна, колькі ва ўменні сабрацца ў адказны момант. Вось малодшая дачка Малання ў яслях: заходзіць разам з іншымі малымі ў музычную залу. Яна нават не вельмі разумее, што адбываецца. Вачыма знаходзіць мяне, і... вуаля — на сцэне на аднаго маленькага акцёра менш. А маленькі анёлак ужо сядзіць у мяне на руках, моцна абхапіўшы за шыю... Цяпер малой чатыры, і яна спрытна танцуе вясновы танец для мамы, але вяршок расказвае пакуль ціха і нясмела... Я з усіх сіл стараюся не заплакаць. Як жа яна вырасла!..

**Уля не малюе па замове — толькі з натхнення. Маёй задачай было стварыць ёй у дзень экзамену добры настрой. Але здарылася сапраўдная катастрофа.**

Уля зусім іншая, гэта — дзяўчынка-прыгода. Ёй часта давалі галоўныя ролі. Яна смелая, гучная і любіць усеагульную ўвагу. У яслях малая адзіная з дзяцей у сваёй групе не адчула жаху ад выгляду Дзеда Мароза, яна ледзь не сама адабрала ў яго падарунак. Пасталеўшы, спрабавала кантраляваць іншых. Напрыклад, яе партнёр у танцы рабіў няправільны рух, яна яго выпраўляла, але калі раптам сустракала супраціўленне, то сядала на крэселка для акцёраў, і нішто ўжо не мог яе падняць. Пастаноўка заставалася без галоўнага героя... Вопыт выхавальнікі атрымалі, і таму ва Ульяны часта ёсць дублёр, а часам ёй увогуле не даюць галоўную ролю. Дома мы прывыклі не выпускаць яе з-пад увагі, бо энергія б'е фантанам, сама яна любіць эксперыменты, а пра вынікі ўвогуле не думае.

Сёлета Ульяна паступала ў гімназію-каледж мастацтваў. Гэта вельмі добрая школа, праўда, там пры паступленні трэба здаваць экзамен. Адбіраюць дзяцей ва ўстанову, ацэньваючы іх творчы малюнак. Уля малюе выдатна. У гэтым плане яна заўседы апярэджвала аднагодкаў, але ў плане самадысцыпліны пакуль застаецца на ўзроўні дзіцячага садка, а ніяк не другакласніцы. Уля не малюе па замове — толькі з натхнення. Маёй задачай было стварыць ёй у дзень экзамену добры настрой. Але здарылася сапраўдная катастрофа. Менавіта тады мы адпраўлялі старэйшага сына ў лагер. Уля таксама хацела, але ж у яе іспыты. І ўсё, яна насупілася і не захацела ісці маляваць. З вялікай цяжкасцю мы ўгаварылі яе хоць проста пайсці на экзамен. Я выдыхлася на стадыі перамоў. Муж узяўся давезці малую да будынка гімназіі. У яго быў план: не падкупляць яе, а проста «выпадкова» зайсці ў кавярню папіць кавы — магчыма, сэрца дзяўчынкі памякчэе, яна папросіць што-небудзь смачнае і, лёгка займеўшы «хацелку», натхніцца. Муж замовіў кавы, але малую нічога не зацікавіла.



Яна села за столік хмурная. Муж піў каву, спрабуючы прыдумаць «план Б», а Уля дэманстратыўна сумавала, перыядычна ёрзаючы ў крэсле. І раптам малая ўскрыкнула і ўскочыла! Аказалася, што на крэсле... ляжала зубачыстка, якая пракалола спадніцу і, за адным разам, мяккае месца. Тут жа каля іх апынулася афіцыянтка, якая дастала зубачыстку, што захрасла ў спадніцы, у якасці выбачэння прапанавала мужу не плаціць за каву, а Улі прынеслі марожанае. Дачка з татам смяяліся ўсю дарогу да гімназіі. У выніку экзамен быў здадзены паспяхова. Работа Ульяны была адна з найлепшых, і яна паступіла. Засталося адолець самую дробязь: вучыцца так, каб не адлічылі. Вось так цудоўнай зубачыстцы ўдалося зрабіць тое, што не змаглі два дарослыя чалавекі.

# ДРЭННЫЯ САКРЭТЫ,

## або Як вучыць дзяцей правілам бяспечных паводзін

**Гэту лічбу агучылі прадстаўнікі МУС: 487 дзяцей пацярпелі ад педафілаў у Беларусі толькі ў 2019 годзе. Статыстыка міністэрства сведчыць пра тое, што за апошнія некалькі гадоў колькасць пацярпелых дзяцей павялічылася ў некалькі разоў. Гэта стала вялікай праблемай не толькі для міліцыянераў, але і для бацькоў. Як зберагчы сваё дзіця ад злачынцаў? Як навучыць малых, не запалохваючы іх, правілам бяспечных паводзін? Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказала псіхолаг, заснавальніца праекта «Школа дзіцячай бяспекі Life School», аўтар праграмы па бяспецы дзяцей дома, на вуліцы і ў інтэрнэце Ганна НОСАЧ.**

— Сусветная статыстыка сведчыць пра тое, што адно дзіця з пяці сутыкалася ў сваім жыцці з сексуальным гвалтам, — кажа спецыяліст. — Прычым гэта не заўсёды палавы акт. Траўміруюць дзяцей і дакучлівыя размовы на тэму сексу, і дотыкі да інтымных частак цела... Таксама злачынствам лічыцца фатаграфаванне дзіцяці ў непрыстойных позах. Самае крыўднае, што 80 працэнтаў такіх зладзеяў — гэта сваякі альбо знаёмыя сям'і.

**Злачынцы выглядаюць як звычайныя людзі, могуць здавацца вельмі добрымі.**

Псіхолаг лічыць, што самае галоўнае — навучыць дзіця таму, што яго цела належыць толькі яму і толькі яно само вырашае, што яму падабаецца, а што не. Бывае, што маці несвядома прывучае дзіця да таго, што яго цела яму не належыць. Напрыклад, у госці ў сям'ю наведалася сяброўка ці бабуля, якая прыязджае рэдка. Многія бацькі, каб паказаць сваю гасціннасць, просяць сваё дзіця пацалаваць ці абняць госцю з ветлівасці.

**Нельга бегчы туды, дзе няма людзей, ці хавацца.**

— Гэта даволі частая памылка дарослых, — сцвярджае псіхолаг. — Ні у якім разе нельга прымушаць дзіця гэта рабіць. Такія дотыкі павінны рабіцца адназначна без прымусу і пагрозы страціць падарунак ад госця.

## КАЛІ НЯМА ДАВЕРУ...

Яшчэ адна праблема — гэта тое, што дзеці могуць не адрозніваць добрыя і дрэнныя сакрэты. Вопыт паказвае, што злачынцы, якія «злоўжываюць» дзіцем, часта пераконваюць малых, што гэта будзе «іх сакрэтам». Нярэдка за маўчанне непаўналетняму прапаноўваюць нейкія падарункі або грошы, ці проста пагражаюць тым, што заб'юць бацькоў дзіцяці альбо зробяць так, што іх, напрыклад, пасадзяць у турму. Злачынцы часта спрабуюць усяліць у дзіця пачуццё віны, маўляў, сам вінаваты ў тым, што здарылася, бо гэтага хацеў.

— Бацькі павінны растлумачыць сваім дзецям, што калі сакрэт выклікае ў яго страх, сум, крыўду ці ўвогуле любое непрыемнае пачуццё, то пра гэта лепей ім расказаць, — тлумачыць Ганна Носач. — Але справа ў тым, што дзіця можа падзяліцца сваёй праблемай з бацькамі толькі тады, калі па-сапраўднаму давярае родным і адчувае сябе з імі побач у бяспецы. Нават у тыя моманты, калі дзіця правініцца, яно павінна быць упэўнена, што на яго не абрынецца шквал лаянкі і абраз ці ўвогуле фізічнае пакаранне. Дзіця ніколі не стане расказваць даросламу пра сваю праблему, калі паміж імі няма даверу.

## РАСКАЗАЦЬ І НЕ НАПАЛОХАЦЬ

У кожнага дзіцяці свой узровень адчувальнасці. Адно дзіця ўразлівае, іншае ўсё прапускае міма вушэй. Пра гэтыя асаблівасці могуць ведаць толькі бацькі. У выпадку небяспекі, дзеці, як і дарослыя, паводзяць сябе па-рознаму.

Адно сарыентуецца і стане ўцякаць і крычаць, другое можа замерці... Каб не напалохаць дзяцей, гаварыць аб правілах бяспекі трэба прыкладна так, як аб правілах гігіены.

— Дзеці ж ведаюць, што трэба чысціць зубы. Таксама яны павінны ведаць, што ніколі адэкватны незнаёмы дарослы не стане прасіць дзіця аб дапамозе і нічога яму не прапануе без дазволу бацькоў, — кажа спецыяліст. — Калі такое здараецца, то малы павінен усведамляць, што гэта сітуацыя ненармальная, тут нешта не так. У любой сітуацыі, дзе дзіця адчувае сумненне, яно павінна звярнуцца па дазвол ці тлумачэнне да бацькоў.

У сітуацыях, калі бацькоў побач няма, ёсць правіла, якое, на думку псіхолага, павінна ведаць кожнае дзіця. Яно гучыць так «Не! Бяжы! Раскажы!»

— Калі сітуацыя незразумелая ці пагражальная, напрыклад, чужы дарослы нешта пытае ў малога ці просіць дапамогі, то дзіця павінна гучна і смела адказаць «Не!» — тлумачыць псіхолаг. — Калі ж дзіця адчувае, што за ім нехта ідзе, ці пагрозу ўвогуле, яно павінна навучыцца бегчы ў бок людзей, напрыклад, у краму, і там папрасіць дапамогі ў работнікаў. Ніколі нельга бегчы ў пад'езды ці ў парку, таксама важна не хавацца. І апошняе — «Раскажы!» — датычыцца сітуацыі, калі малога схапілі на вуліцы і цягнуць. Важна, каб дзіця гучна крычала пра тое, што яго цягне чалавек, якога яно не ведае.

## У ЧОРНЫМ ПАЛІТО І КАПЕЛЮШЫ

«Чорнай-чорнай ноччу, на чорнай-чорнай машыне прыехаў чорны-чорны чалавек»... Пачатак дзіцячай палохалкі нагадвае ўяўленні малых аб злачынцах. На самай справе, растлумачыўшы малому правілы бяспечных паводзін на вуліцы, бацькі забываюць такую важную рэч, як апісанне злачынцы. Дзецям нічога не застаецца, як толькі ўявіць сабе злодзея так, як малююць яго ў дзіцячых казках, паказваюць у мультфільмах ці кіно. Трэба тлумачыць, што злачынцам можа быць мужчына, жанчына і нават падлетак. Яны выглядаюць як звычайныя людзі, а каб выклікаць давер дзяцей, могуць пераадзецца ў міліцыянера ці доктара.

**Чужыя дарослыя нічога не прапаноўваюць дзіцяці без дазволу бацькоў.**



Гэта можа быць незнаёмец, малазнаёмы сусед — ды хто заўгодна. Таму важна не толькі размаўляць з дзецьмі і вучыць іх правілам, але ўсё ж і прыглядаць за імі.

## ВУЧЫЦЬ САМАСТОЙНАСЦІ

Псіхолаг упэўнены, што любое дзіця можна прымусіць вывучыць правілы бяспекі, але... Не кожнае дзіця іх стане выкарыстоўваць. Справа ў тым, што ў малых да сямі гадоў пераважаюць эмоцыі. І калі такому малому прапанаваць «паглядзець коцікаў», то яно не будзе адчуваць небяспеку, а будзе думаць пра магчымасць палашчыць кацяня. Толькі пасля сямі гадоў у дзіцяці пачынаюць развівацца тыя долі мозга, якія адказваюць за рацыянальнасць. Таму адказнасць за бяспеку дзіцяці заўсёды нясуць бацькі.

**Чужыя дарослыя не просяць дапамогі ў дзяцей.**

Але, нягледзячы на ўзрост, дзеці псіхалагічна і фізічна спеюць па-рознаму. Бацькі павінны адэкватна ацэньваць сталасць свайго дзіцяці. Напрыклад, калі яны разумеюць, што дзіця імпульсіўнае, нядоўга задумваецца над тым, што робіць, то яго трэба даўжэй трымаць пад сваім кантролем. Імпульсіўныя малыя на вуліцы будуць бегчы туды, дзе ім цікавей. Дзецям больш задуменным, нерашучым будзе цяжка аказаць супраціўленне чужым дарослым, ім страшна выразна і гучна папрасіць аб дапамозе ці ўвогуле закрычаць і пабегчы. Таму прывучаць дзіця да самастойнасці, адпускаць яго гуляць аднаго ці пакідаць дома без дарослых трэба, азіраючыся не на ўзрост, а на адэкватную ацэнку асаблівых рыс і спеласці малога.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# «Пасля цярпення вучымся доўгацярпенню»



(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

***— У адным з інтэрв'ю вы расказвалі, што ў той час, калі дачка расла, каля 5 гадоў правялі на гастролях...***

— Калі падсумаваць усе канцэрты, карпаратывы, гастролі па розных краінах — так, каля пяці гадоў. Гэта якраз быў час станаўлення гурта «Новы Ерусалім», трэба было вырашаць фінансавыя пытанні, бо музыка — далёка не тое, што дазваляе бязбедна жыць у нашай краіне... Я працяглы час адсутнічаў дома, але ўсё ж не так, што з'ехаў на гастролі, калі дачцэ было тры гады, а вярнуўся — калі ўжо восем, таму не скажу, што многае прапусціў. Хоць, канешне, часам шкадую, што здараліся моманты, калі Насці была патрэбная менавіта мая падтрымка і дапамога, а мяне не было дома. Але ўвесь гэты час побач знаходзілася мама. Я прыхільнік кансерватыўных поглядаў у тым сэнсе, што свет жанчыны — перадусім дом, сям'я, дамашні агмень і ўтульнасць, а свет мужчыны — за сценамі дома, дзе трэба здабыць рэсурсы і грошы, каб забяспечыць сваю сям'ю, гэты маленькі, але вельмі важны сусвет. Я прыйшоў у калектыў ужо жанаты, а наш клавішнік Вадзім Калацэй ажаніўся неўзабаве, і ў яго нарадзілася двойня, таму мы і нашы жонкі разумелі і падтрымлівалі адно аднаго... Мая жонка Таццяна прыняла рашэнне спыніць сваю прафесійную кар'еру педагога, каб прысвяціць сябе дачцэ: школьныя ўрокі, заняткі ў музычнай школе — усё гэта было на ёй. І, дарэчы, па сёння ў Насці і Таццяны вельмі добрыя адносіны, яны не толькі мама і дачка, але і сапраўдныя сяброўкі, а паколькі яшчэ падобныя знешне, то знаёмыя часам нават блытаюцца, сустракаючы іх у горадзе.

Наступны этап бацькоўства — з'яўленне Лявона. Калі ён стаў часткай нашай сям'і, прынялі рашэнне, што больш чым у двухтыднёвыя паездкі я не выпраўляюся, бо Лявон вельмі актыўны хлопчык, жвавы, ён вельмі многа гаворыць, спявае, бясконца задае пытанні і запаўняе сабой усю прастору... Бывае, увечары мы садзімся на канапу і разумеем, што ў нас ужо «селі батарэйкі», а яму хоць бы што. Таму з гэтым выбуховым тэмпераментам і складам характару нам з Таццянай даводзіцца абодвум шмат працаваць, і я стараюся больш часу праводзіць з ім, дапамагчы жонцы і пэўным чынам кампенсаваць той час, калі я буду адсутнічаць дома з-за канцэртаў. Нарыклад, мы з Лявонам удвух ходзім у цырульню да аднаго і таго ж майстра, разам катаемся на роварах і шмат гуляем, і ў некаторых кароткатэрміновых паездках ён таксама побач са мной, за кулісамі. Часам нават узнікаюць спрэчкі з жонкай, бо мы з Лявонам два хлопцы, да таго ж аднолькавыя па тэмпераменце, адзін аднаго добра разумеем, а Тані даводзіцца зміраццa з нашай агульнай актыўнасцю.

***— Калі ад'язджаеце ў працяглыя гастролі, як трымаеце сувязь з сям'ёй?***

— Ужо гадоў дзесяць не быў у ЗША, таму на пачатку красавіка збіраўся адправіцца ў канцэртны тур па Дэнверы, Сан-Дыега, Сакрамента, Лос-Анджэлесе, Портлендзе, Сіэтле, Мічыгане... Спадзяюся, гэты тур, па зразумелых прычынах адкладзены, усё ж адбудзецца пазней. Але ў любым выпадку, сёння, дзякаваць Богу, нескладана знаходзіцца на сувязі ў любы час праз Viber, WhatsApp і іншыя сэрвісы. Не тое, што ў 90-я, калі купляеш тэлефонную картку за 10 долараў, а хвіліна размовы каштавала ці то 60, ці то 80 цэнтаў, і карткі ўвесь час заканчваліся, тады дасылаў дамашнім паштоўкі і лісты. Жонка, дарэчы, дагэтуль захоўвае гэтыя прывітанні з гастроляў.



***— Дачка доўга займалася музыкай, але стала ў выніку фатографам. Ці важна для вас, каб сын працягнуў творчую справу?***

— Ён не займаецца музыкай прафесійна, але добра інтаніруе і вельмі многа спявае, спрабуючы на сваёй мове перадаць англійскую — любіць Imagine Dragons, музыку з Ninjago, наогул розныя мелодыі; любіць маляваць, і, канешне, Lego — гэта проста наша ўсё, дэталі знаходзім і пад канапай, і ў газоне, дзе заўгодна. Плюс яшчэ ён займаецца ў тэатральнай студыі «Галактыка», дзе яму таксама вельмі падабаецца, а для фізічнага развіцця — лёгкая атлетыка і плаванне. Кожны дзень вельмі насычаны, але я бачу, што яму гэта неабходна: нават на прагулках усе ідуць, а Лявон бяжыць, скача, яму трэба кудысьці падзець усю сваю бурлівую энергію... Пакуль што ў сілу характару і тэмпераменту яму складана стрымліваць эмоцыі і на чымсьці доўга канцэнтравацца, і над развіццём уседлівасці мы таксама працуем. Кім ён стане, загадваць пакуль рана. Для мяне не важна, што ён абярэ, але важна, каб у абраным кірунку Лявон сапраўды развіваўся, быў добрым спецыялістам.

Магчыма, як бацька я крыху перахвальваю сваё дзіця. Але, мне здаецца, мы павінны любіць сваіх дзяцей, бо калі мы не марым разам з імі, не верым у іх — то хто гэта зробіць за нас? З іншага боку, безумоўна, трэба ўсталёўваць і пэўныя межы. На мой погляд, гэта боскі прынцып: неба і зямля, мора і суша маюць паміж сабой межы, у любой ракі ёсць берагі, і гэтаксама свае «берагі» павінны быць у дзяцей і падлеткаў.

***— І як вы іх усталёўваеце? У наш час вельмі многа дыскусій наконт методык выхавання, наконт таго, што варта дзецям дазваляць, а што забараняць, дзе іх кантраляваць, а дзе «адпускаць», каб пазбегчы гіперапекі і інфантылізму...***

— Не думаю, што мы вынайшлі тут веласіпед, — як ва ўсіх сем'ях, ёсць свае дамоўленасці, што можна і нельга, ёсць стымулы і пакаранні. Лявона, напрыклад, мы пэўны час саджалі на табурэтку, і ён сядзеў моўчкі, абдумваючы свае паводзіны. Што да бацькоўскай папругі, я прыгадваю выпадак са сваім сябрам, які жыве ў Германіі. Аднойчы ён так пакараў сына — і суседзі выклікалі паліцыю. Паліцэйскія спыталі: «Чаму вы так пакаралі сына?» — «Каб потым, калі ён вырасце, вы не білі яго дубінкамі», — адказаў бацька. Як мне здаецца, у такім падыходзе ёсць свая мудрасць: ні ў якім выпадку не біць дзіця, а менавіта пакараць, «даць рады» на будучыню. Цяпер, канешне, часцей выхоўваюць словам — павышэнне тону, забарона ці абмежаванне, скажам, прагляду мультфільмаў адыгрываюць сваю выхаваўчую ролю. Балазе, у Лявона няма залежнасці ад гаджэтаў: на планшэце ён глядзіць «Паляванне на рачных монстраў», сюжэты пра дзікую прыроду National Geographic, разглядае цікавыя «фішкі» з «АліЭкспрэс» альбо сюжэты, як збіраюць яго любімыя канструктары.



***— Насця нарадзілася, калі вам быў толькі 21 год, Лявон стаў часткай сям'і, калі вам з жонкай было за 40. Як з узростам і вопытам змянілася стаўленне да бацькоўства?***

— Напэўна, яно стала больш усвядомленым. Калі жыццё збольшага наладжана, ёсць пэўная стабільнасць, у тым ліку фінансавая, то адчуваеш сябе сталым чалавекам, які з большай адказнасцю, разуменнем і цярпеннем выхоўвае дзіця, — прынамсі, імкнешся да гэтага. Хрыстос казаў: «Сын нічога не можа тварыць сам ад сябе, калі не ўбачыць Айца ствараючага», і я бачу гэту біблейскую ісціну ў жыцці: тое, што раблю я, капіруе і робіць мой сын. Сярод галоўных рэчаў, якім можа і павінен навучыць сына бацька, — умець несці адказнасць, праяўляць насамрэч моцны, мужчынскі характар, старацца даводзіць распачатую справу да канца, абараняць слабых, быць шчырым — звычайныя хрысціянскія рэчы, якімі трэба кіравацца штодня.

Ведаеце, часта мы плануем загадзя для сваіх дзяцей будучую прафесію, кар'еру, але мала задумваемся пра тое, што рана ці позна дзеці вырастуць, створаць сям'ю. І правільна было б зрабіць выбар раз і назаўжды, пражыць з адным чалавекам усё жыццё. Таму ўжо сёння кажу сыну, што аднойчы ў яго будзе свая сям'я, жонка і дзеці, — і ён разважае на гэты конт: якой ён бачыць сваю будучую сям'ю і стасункі ў ёй.

***— Якім рэчам, у сваю чаргу, навучылі вас дзеці, акрамя бязмежнага цярпення?***

— Пасля цярпення яны вучаць нас доўгацярпенню — гэта пераход на наступны ўзровень, калі здаецца, што ўсё, цярпенне скончылася, — смяецца Аляксандр. — Калі гаварыць пра Лявона, у яго вельмі добрае сэрца, ён умее дараваць, аказваць прыемныя знакі ўвагі — так, напярэдадні 8 Сакавіка прывёз букет цюльпанаў нашай агульнай цырульніцы, якую называе няйначай як «любімая жанчына». А яшчэ ён вучыць, як важна берагчы дзіцячыя пачуцці: у яго здарылася першая закаханасць, і Лявон гаворыць: «Мне падабаецца адна дзяўчынка, толькі гэта сакрэт, давай маме не скажам?»

Дачка — прыклад таго, што не толькі бацькі дапамагаюць дзецям і падтрымліваюць іх, але і наадварот. Насця разам са сваім мужам Кірылам вельмі дапамагаюць мне ў інтэрнэт-прасоўванні, узімку для прэзентацыі кліпа зрабілі класныя ролікі для рэкламы ў «Інстаграме», да таго ж дачка выдатна афармляе мае думкі ў тэксты. Наогул, хоць яна ўжо пяты год замужам, у нас застаецца шчыльная сувязь і бацькоўская, і творчая, прафесійная. Дарэчы, менавіта дачка прапанавала мне паспрабаваць сябе ў новай сферы — рэгістрацыі шлюбных цырымоній, і цяпер гэты кірунак я таксама досыць актыўна развіваю.

***— Што ў вашым жыцці змянілася з уваходжаннем у нядаўна створаны Савет бацькаў?***

— На мой погляд, гэта вельмі добры рух — калі мужчыны не толькі рэалізуюцца ў прафесійным плане, робяць кар'еру, але застаюцца сябрамі сваім дзецям, уголас абмяркоўваюць і шукаюць выйсце з праблем, якія часам узнікаюць у стасунках у кожнай сям'і. Ідэя важная і патрэбная, таму я па меры сіл яе таксама падтрымліваю — у прыватнасці, плануецца правесці ў Лошыцкім парку сямейны фестываль, і я буду браць у ім удзел як артыст, далучаюся і да іншых мерапрыемстваў Савета бацькаў.

* * *

— Нарадзіць дзіця — самае простае, складана вырасціць і выхаваць яго, — разважае Аляксандр. — На выхаванне патрэбна шмат гадоў, за якімі стаяць эмоцыі, радасці і расчараванні, пройгрышы і перамогі... Важна перажываць і праходзіць іх разам са сваімі дзецьмі, каб яны адчувалі, што сям'я заўжды побач і што менавіта наша з'яднанасць, згуртаванасць у адно цэлае дапамагаюць пераадолець жыццёвыя цяжкасці. Канешне, не варта «загружаць» дзяцей сваімі дарослымі праблемамі — у іх павінна быць дзяцінства і час на сталенне. Але, з іншага боку, трэба, каб дзеці разумелі, што жыццё — не суцэльная вясёлка і шчасце, што на розных этапах іх чакаюць свае выпрабаванні... Гіперапека — так, адна з праблем нашых дзён. Ведаеце, калі я рос, веласіпед быў за шчасце (хоць у мяне былі і вельмі добрыя цацкі, на радыёкіраванні); а сёння многія бацькі абагаўляюць дзяцей, тыя становяцца аб'ектам пакланення і з маленства атрымліваюць усё, што толькі пажадаюць, не прыкладваючы для гэтага намаганняў, — і пазней не могуць, не ўмеюць пастаяць за сябе, дабіцца пастаўленай мэты. Гэтаму трэба вучыць таксама, як мы вучым правілы бяспекі, этыкет, школьныя ўрокі.

Аляксандр і Таццяна Патліс ведаюць гэта лепш за многіх: яны ўсынавілі Лявона, калі малому было каля 1,5 года. Зрабілі гэты крок цалкам свядома, разумеючы вялікі аб'ём работы і «прыцірак», канфліктаў, крызісаў росту — праходзяць іх разам, не зважаючы на меркаванні навакольных пра гены, наканаванасць, няўдзячнасць і гэтак далей. Проста цаглінка за цаглінкай закладваюць не толькі фінансавы, але і маральны фундамент — для таго, каб дзеці насамрэч раслі, развіваліся і мелі ўсе магчымасці раскрываць свае таленты і здольнасці, у рэшце рэшт стаць лепшымі за бацькоў. Ці не ў гэтым і ёсць шчасце бацькоўства?

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з асабістага архіва выканаўцы.**

## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Выигрывай с Onliner 12»

1. Организатор рекламной игры:

Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220089, г. Минск, пр. Дзержинского, 5-613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Сроки проведения рекламной игры:

Срок начала рекламной игры – 08.03.2020.

Срок окончания рекламной игры – 08.05.2020.

3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3753 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 21.02.2020.

4. Количество участников рекламной игры – 1713 человек.

5. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 3762,54 (три тысячи семьсот шестьдесят два) белорусских рубля (пятьдесят четыре) копейки. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

6. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, имя, отчество победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Булка Юлия Александровна | Приз 1 – мобильный телефон (смартфон) Honor 9X 4GB/128GB Sapphire Blue (STK-LX1), денежные средства в размере 54,86 бел. руб. |
| 2 | Рымарь Константин Викторович | Приз 1 – мобильный телефон (смартфон) Honor 9X 4GB/128GB Sapphire Blue (STK-LX1), денежные средства в размере 54,86 бел. руб. |
| 3 | Артамонов Дмитрий Алексеевич | Приз 1 – мобильный телефон (смартфон) Honor 9X 4GB/128GB Sapphire Blue (STK-LX1), денежные средства в размере 54,86 бел. руб. |
| 4 | Герасимович Антон Валерьевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 5 | Ильяшенко Денис Петрович | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 6 | Мартьянов Александр Петрович | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 7 | Михальчук Сергей Сергеевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 8 | Гурин Федор Александрович | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 9 | Добровольский Евгений Игоревич | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 10 | Панасенко Александр Сергеевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 11 | Павлов Антон Васильевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 12 | Бычков Максим Александрович | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 13 | Смеховский Евгений Анатольевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) |
| 14 | Громов Вадим Олегович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 15 | Титов Максим Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 16 | Титов Максим Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 17 | Пантюхин Вадим Евгеньевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 18 | Ивко Глеб Олегович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 19 | Станкевич Александр Феликсович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 20 | Воробьёв Александр Геннадьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 21 | Раковец Вадим Васильевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 22 | Басалай Юрий Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 23 | Боровский Дмитрий Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 24 | Перкулевич Вероника Леонидовна | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 25 | Чернышёв Артур Алексеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 26 | Михневич Александр Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 27 | Сметанин Роман Сергеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 28 | Богданович Алексей Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 29 | Кравчёнок Сергей Вячеславович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 30 | Михайловский Виталий Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 31 | Башкинов Вячеслав Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 32 | Каско Владимир Сергеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 33 | Шумский Вадим Дмитриевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 34 | Кирилов Макс Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 35 | Калачёв Игорь Анатольевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 36 | Чернышёв Артур Алексеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 37 | Рыдевский Евгений Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 38 | Шафаревич Жан Геннадьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 39 | Берёзко Сергей Витальевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 40 | Богдан Виктория Владимировна | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 41 | Гурин Федор Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 42 | Ференчук Дмитрий Вадимович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 43 | Ярошонок Андрей Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 44 | Дунаев Дмитрий Святославович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 45 | Пытляк Александр Васильевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 46 | Цветков Руслан Олегович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 47 | Семеняко Артём Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 48 | Пархоменко Александр Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 49 | Данилин Дмитрий Анатольевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 50 | Борисик Евгений Михайлович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 51 | Евсеенков Алексей Эдуардович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 52 | Лось Алексей Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |
| 53 | Абрамчук Владислав Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) |

7. Для получения призов победители должны явиться не позднее 08.05.2020 (включительно) по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 5, офис 613, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
## по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 19 мая 2020 года

